ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ЛІСТАПАДА 2018 г. ЧАЦВЕР № 225 (28841)

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ЛАПКО, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:

«У многіх краінах свету існуе механізм абароны банкаўскіх укладаў — сістэма гарантавання ўкладаў, сутнасць якой заключаецца ў тым, што ў выпадку адклікання ліцэнзіі ў банка або яго банкруцтва адказнасць за выплату грашовых сродкаў укладчыкам бярэ на сябе спецыяльна створаная арганізацыя. У Беларусі гэтая сістэма дзейнічае з 1995 года. Сістэма не павінна быць статычнай. Мы за эвалюцыйнае развіццё, вывучэнне і затым прыняцце рашэння аб тым, што нам рабіць далей, што мяняць. Сістэма павінна эвалюцыянаваць з улікам шматлікіх фактараў. Калі і будзем прымаць нейкае рашэнне, калі сума кампенсацыі будзе перагледжана, будзем арыентавацца на тое, каб мы пакрывалі па фізічных асобах практычна 100 %, бо ў нас сацыяльна арыентаваная дзяржава».

КАРАТКА

- **Урад падрыхтаваў праект пастановы аб павышэнні мінімальнай зарплаты.**
- У Гродзенскай вобласці самым папулярным відам дзейнасці сярод самазанятых застаецца рэпетытарства, на цяперашні момант зарэгістравана больш за 750 чалавек.
- **Фрагменты легендарнага танка Т-34-76 раскапалі ў пасёлку Залаты Рог Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.**
- Беларуска Марыя Васілевіч увайшла ў топ-30 на конкурсе «Топ-мадэль свету» ў рамках конкурсу «Міс свету — 2018».

ISSN 1990 - 763X

Вялікая кніга Гісторыі

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Нядаўна пабачыў свет 4-ы, заключны, том «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі». Гэта ўнікальнае выданне, у якім упершыню сабраны навукова-даведачныя картаграфічныя творы, якія адлюстроўваюць гістарычнае мінулае нашай дзяржавы. Такім чынам мы атрымалі поўнае, навукова дакладнае ўяўленне пра гісторыю Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці.

Учора «Вялікі атлас» урачыста прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі з удзелам стваральнікаў выдання, дзеячаў культуры і навукі, прадстаўнікоў дыпламатычных місій. Дзякуючы ўяўнай экскурсіі па старонках чатырох тамоў прысутныя змаглі прасачыць гісторыю Беларусі ад каменнага веку да XXI стагоддзя.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Далёкае-блізкае

ДРАЎЛЯНАЯ, КАМЕРНАЯ, УНІКАЛЬНАЯ

Беларуская царква ў Лондане намінавана на найвышэйшую архітэктурную ўзнагароду Еўропы

Беларуская царква, пабудаваная ў Лондане па замове беларускай дыяспары архітэктарам Цзыўаем Со, ужо атрымала шматлікія ўзнагароды ў архітэктурных конкурсах. Спраборнічаючы з будынкамі, створанымі найлепшымі архітэктурнымі школамі свету, яна неаднаразова абыходзіла іх і прызнавалася пераможцай. Камернасць, архітэктурная вытанчанасць і ўзнёсласць да неба сумяшчаюцца ў ёй з пэўнай утульнасцю і нават дамашняй атмасферай. Цяпер царква зноў намінавана — на званне найлепшага будынка ў Еўропе! Карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з яе стваральнікам — архітэктарам Цзыўаем Со і распытала пра крыніцы натхнення і пра нюансы будаўніцтва беларускай царквы ў Лондане.

СТАР. 13



Фота Якіма БАРАНА.

50+: жыць цікава!

СМАРТФОН — НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЎНУКАЎ

Пажылыя беларусы асвойваюць мабільныя тэхналогіі

Яшчэ зусім нядаўна многія нашы пенсіянеры марылі знайсці агульную мову з персанальным камп'ютарам, а планшэты і смартфоны лічыліся атрыбутам моладзі. Час ідзе, і сёння гэтыя разумныя прылады становяцца ўсё больш папулярнымі і сярод людзей залатога ўзросту. Яны вельмі зручныя — гэта сапраўдныя міні-камп'ютары ў кішэні. З іх дапамогай можна не толькі патэлефанаваць сваякам, але і ў любы час і ў любым месцы заходзіць у інтэрнэт і чытаць навіны, аплачваць камунальныя паслугі, а калі ўсталяваць на смартфон спецыяльныя праграмы для кантролю здароўя, то цаны такому мабільнаму памочніку не будзе.

СТАР. 4

ПА-БРАЦКУ, ПА-СЯБРОЎСКУ, ПА-ПАРТНЁРСКУ

Галоўнае пытанне адносін паміж Беларуссю і Расіяй — роўныя ўмовы

Учора адбылася сустрэча Прэзідэнта з міністрам замежных спраў Расіі Сяргеем Лаўровым.

У пачатку беларускі лідар адзначыў, што бакам ёсць пра што пагаварыць. «Хоць сакрэтаў у мяне ад Міністэрства замежных спраў Беларусі няма, і я думаю, ваш калега, карыстаючыся вашымі давернымі адносінамі, вельмі падрабязна расказаў вам пра сітуацыю ўнутры краіны, пра нашы памкненні. Вы чалавек дасведчаны і ўмееце чытаць паміж радкоў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт дадаў, што сёння з'яўляецца розная інфармацыя, «пішуць усякае», на што ён рэагуе некалькі хваравіта і не можа адвыкнуць ад гэтага за столькі гадоў. «Таму вось такая размова сам-насам, яна заўсёды карысная — гэта першае, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Другое: вы ведаеце, у нас быццам бы і нядрэнныя адносіны складваюцца ў цэлым з Расійскай Федэрацыяй, нават вельмі добрыя. Факт, што лепшыя, чым з іншымі дзяржавамі».

Ён звярнуў увагу, што паміж дзяржавамі існуе адно галоўнае пытанне, якое неабходна вырашыць. Яно, па словах беларускага лідара, абмяркоўваецца на самым высокім узроўні, яго абмяркоўваюць міністэрствы замежных спраў, прычым абмеркаванне пачалося яшчэ ў часы Барыса Ельцына. «Роўныя ўмовы для працы людзей, суб'ектаў гаспадарання ў нашай агульнай айчыне, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я так гэта называю, і інакш, напэўна, не назавеш. Калі ёсць такая розніца ў рабоце суб'ектаў гаспадарання ў парушэнне нашых дамоваў, якія існуюць, гэта дрэнна. Вось трэба вырашыць гэтае асноўнае пытанне, і я думаю, у нас ніколі не будзе прэтэнзій да Расіі, а ў Расіі — да нас».

Беларускі лідар таксама заўважыў, што калі ў Беларусі і Расіі гандлёвае сальда складваецца ў велізарны мінус, то нашай краіне даводзіцца шукаць дзесьці па ўсім свеце, каб закрыць гэты дысбаланс. Іншымі словамі, усё ідзе ад эканомікі.

«А так, увогуле, сітуацыя нядрэнная», — канстатаваў ён.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ставіць у прыклад работу Міністэрства абароны і Міністэрства замежных спраў, асабліва апошняга, паколькі ёсць поўнае разуменне, але ёсць і пытанні, пра якія трэба казаць «гледзячы адзін аднаму ў вочы».

Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў паведаміў пра сумеснае пасяджэнне калегіі Міністэрства замежных спраў Беларусі і калегіі Міністэрства замежных спраў Расіі, якое адбылося літаральна перад сустрэчай з кіраўніком дзяржавы.

«Мы лічым, што трэба цалкам выконваць дамоўленасці, якія былі, як у адносінах да гаспадарчых суб'ектаў, так і ў дачыненні да грамадзян. У нас многія рэчы ўжо вырашаны, але па асобных пытаннях патрэбна работа, і мы, як знешнепалітычнае ведамства, будзем усяляк спрыяць таму, каб адпаведныя структуры дзвюх краін дамаўляліся», — заявіў міністр замежных спраў Расіі.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ЧАКАЕМ РАШЭННЕ Ў СНЕЖНІ

Пагадненне аб узаемным прызнанні віз можа быць падпісана на саюзным Саўміне, расказаў журналістам міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў па выніках сустрэчы з кіраўніком дзяржавы.

Апошні раўнд перагавораў па дакументе паміж Беларуссю і Расіяй аб гэтым адбыўся літаральна некалькі дзён таму на ўзроўні дэлегацый. «Чарговай вяхой для выхаду на ўжо канчатковыя дамоўленасці будзе, па-мойму, канец лістапада — пачатак снежня, калі эксперты павінны чарговы раз ужо ў рамках сумеснай рабочай групы па пытаннях міграцыі правесці агляд пакінутых пытанняў, — сказаў ён. — Засталіся там, здаецца, тэхнічныя пытанні. Апошні раўнд зафіксаваў досыць сур'ёзны прагрэс. І на 13 снежня, калі мы плануем правядзенне саюзнага Савета Міністраў, мы разлічваем вынесці гэты праект пагаднення на падпісанне».

ЧАС «ЗВЕРЫЦЬ ГАДЗІННІКІ»

Беларусь была і ёсць выключна мірная дзяржава

Аб гэтым заявіў журналістам міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей, падводзячы вынікі сумеснага пасяджэння калегіі міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Расіі.

Мерапрыемства — пляцоўка, каб «зверыць гадзіннікі» па выкліках на міжнароднай арэне і пытаннях супрацоўніцтва. На сустрэчы абмяркоўвалася партнёрства ў інтэграцыйных саюзах на Еўразійскай прасторы, СНД, АДКБ і структурах АБСЕ, ААН. Таксама ў фокусе — праблема міжнароднай бяспекі.

Адзначыў Уладзімір Макей асаблівую інтэнсіўнасць дыялогу на вышэйшым і высокім узроўнях у бягучым годзе. Міністр замежных спраў звярнуў увагу, што традыцыйна сустрэчы з расійскімі калегамі праходзяць у «цёплай, сяброўскай атмасферы».

Не зняты да канца з двухбаковага парадку дня пытанні эканамічнага кшталту — урэгуляванне сітуацыі, звязанай з падатковым манеўрам і нафтаздабычай. Яны напрамую ўплываюць на баланс у тавараабароце — беларускі экспарт за дзевяць месяцаў гэтага года вырас усяго толькі на 0,6 %, а імпарт — на 22 %.

«Мы ўчора ў фармаце адзін на адзін з Сяргеем Віктаравічам (Лаўровым. — **Аўт.**) абмеркавалі шэраг пытанняў міжнароднага парадку дня, двухбаковых адносін, сітуацыю ў рэгіёне», — сказаў Уладзімір Макей, адзначыўшы, што перагаворы з расійскім калегам не абышліся толькі сумесным пасяджэннем калегій.

Сяргей Лаўроў у сваю чаргу ацаніў, што апошнім часам Беларусь стала пляцоўкай шэрагу міжнародных сустрэч — пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, групы высокага ўзроўню пад старшынствам намеснікаў прэм'ер-міністраў і Форуму рэгіёнаў. Сустрэча прайшла напярэдадні значнай падзеі — пасяджэння Саўміна Саюзнай дзяржавы.

Па словах Сяргея Лаўрова, на ім «будуць прыняты вельмі важныя рашэнні, якія ўмацоўваюць нашу інтэграцыю».

«Мы даём станоўчую адзнаку і інтэграцыйнаму супрацоўніцтву ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, дамовіліся працягваць садзейнічаць пашырэнню і ўмацаванню знешніх сувязяў ЕАЭС у тым ліку з Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва, з краінамі АСЕАН, з Кітайскай Народнай Рэспублікай у рамках злучэння еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў з кітайскай праграмай «Адзін пояс — адзін шлях», — паведаміў Сяргей Лаўроў.

Процідзеянне фальсіфікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, перагляду яе вынікаў, недапушчальнасць гераізацыі фашыстаў, па словах міністраў, таксама стала адной з найважнейшых тэм сустрэчы. Гэтыя ідэі будуць рэалізоўвацца ў рамках умацавання сумеснай культурна-гістарычнай прасторы.

І канешне, увага дзвюх краін будзе скіравана на міжнародную бяспеку ва ўсіх яе вымярэннях, у тым ліку ў кібер- і інфармацыйнай прасторы. Міністры выказалі заклапочанасць у сувязі з узмацненнем ваеннай актыўнасці НАТА каля нашых межаў, а таксама з намерам Вашынгтона выйсці з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Гэта выклікі як для Саюзнай дзяржавы, так і для АДКБ.

Па выніках сустрэчы кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў падпісалі пастанову калегіі і план кансультацый МЗС на 2019 год.

Марыя ДАДАЛКА.

ДАРОГА ПЕРАМЕН

Настае новы этап адносін Беларусі і Еўрапейскага інвестыцыйнага банка

Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскага інвестыцыйнага банка Аляксандрам Стубам.

Па словах кіраўніка дзяржавы, сёння і Еўропа, і ўвесь заходні свет пераканаліся ў тым, што з Беларуссю можна мець справу, што наша краіна — гэта надзейны партнёр, асабліва ў сферы гандлёва-эканамічных, фінансавых адносін. «Ваш візіт сёння і падпісанне ў яго рамках пагадненняў з вашым банкам аб інвеставанні — вельмі важным кірунку развіцця нашай краіны — сведчыць аб тым, што мы пераадолелі ўсякае неразуменне і выходзім на новы этап супрацоўніцтва», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы сёння працуем з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам над крэдытамі на суму каля паўмільярда еўра», — сказаў ён. У Беларусі вельмі старанна адбіраюць праекты для інвеставання, і тое, што Еўрапейскі інвестыцыйны банк дапамагае ініцыятывам, звязаным з людзьмі, жыллём, забеспячэннем вадой, інфраструктурай, дарогамі, вельмі важна для нашай дзяржавы, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Мы будзем надзейнымі партнёрамі ў гэтым плане», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, Прэзідэнт агучыў асабістую просьбу: ён назваў Аляксандра Стуба эфектыўным фінансавым менеджарам, за спінай у якога велізарны досвед на яго радзіме, у Фінляндыі, дзе ў розны час ён займаў высокія дзяржаўныя пасады. «Я вас вельмі папрасіў бы — я дам заданне Міністэрству замежных спраў у гэтым плане яшчэ папрацаваць з беларускага боку — дапамагчы нам устанавіць цесныя адносіны з Фінляндыяй», — сказаў Прэзідэнт.

У Беларусі ў вялікай ступені такая ж структура эканомікі, як у гэтай краіне, таму беларускі бок хацеў бы, каб супрацоўніцтва было на тэхналагічным узроўні. Дапусцім, лес і перапрацоўка драўніны. На думку беларускага лідара, так, як Фінляндыя, у свеце не працуе ніхто па гэтых кірунках. «Калі вы нам дапаможаце, я буду вам вельмі ўдзячны», — дадаў Прэзідэнт.

У адказ Аляксандр Стуб адзначыў «тую выдатную работу, якую мы прарабілі разам з Беларуссю па праектах, дакументы па якіх мы падпісалі ўчора з прэм'ер-міністрам з вашага дазволу. І гэта сапраўды вельмі важныя праекты, адзін з іх звязаны з ачышчальнымі збудаваннямі, іншы — з малымі і сярэднімі прадпрыемствамі».

Нагадаем, напярэдадні Еўрапейскі інвестыцыйны банк падпісаў з Беларуссю пагадненні на суму 160 мільёнаў еўра. Грошы пойдуць на рэканструкцыю Мінскай ачышчальнай станцыі, а таксама на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

НАПЕРАДЗЕ ЯШЧЭ ШМАТ ПРАЕКТАЎ

ЕІБ плануе ў 2019 годзе інвеставаць у Беларусь 260 мільёнаў еўра — аб гэтым па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам расказаў журналістам віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага інвестыцыйнага банка. На яго думку, праекты, на якія пойдуць грошы паводле падпісаных пагадненняў, выгадныя і добрыя не толькі для ЕІБ, але і для беларускага народа.

«Мы таксама абмяркоўвалі нашы будучыя праекты, напрыклад рэканструкцыю трасы М7, энергетыку, супрацоўніцтва ў сферы муніцыпальных паслуг і іншыя канкрэтныя дэталі. Я чакаю плённага, карыснага ўзаемадзеяння ў будучыні паміж Беларуссю і нашым банкам», — дадаў ён.

«У нас ёсць некаторыя планы на будучыню, напрыклад налета мы плануем інвестыцыі ў памеры 260 мільёнаў еўра. Гэта значыць, вы можаце ўбачыць, што ў сярэднім у год памер інвестыцый будзе складаць да 200 мільёнаў, — звярнуў увагу Аляксандр Стуб. — І самае важнае, што гэта прыклад канкрэтнай работы, якую ЕС можа праводзіць для таго, каб дапамагаць сваім партнёрам, наладжваць добрыя адносіны».

Другі момант, які абмяркоўваўся на сустрэчы, — гэта сусветная палітыка. «Прыйшлося ўспомніць пра старое жыццё, пра восем гадоў у фінскім урадзе, — адзначыў ён. — І той аналіз, нашы думкі аб палітычнай сітуацыі ў свеце, аказаліся вельмі падобныя. Мы абмяркоўвалі брэксіт, расстаноўку сіл і баланс паміж такімі ключавымі гульцамі, як ЗША, Расія, Кітай, і многія іншыя рэчы». Па словах Аляксандра Стуба, шмат у чым пазіцыі сапраўды былі вельмі падобныя, паколькі Фінляндыя, як і Беларусь, мае даволі працяглую мяжу з Расіяй.

Цікавы досвед

«КАЛІДОРНЫЯ ДЗЕЦІ» БОЛЬШ НЕ БЕГАЮЦЬ ПА КАЛІДОРАХ

Не ўсе сем'і, асабліва маладыя, маюць уласнае жыллё. Некаторыя здымаюць кватэру, хтосьці жыве ў інтэрнаце. У дзяцей, чый дом — сямейны інтэрнат, месцам для гульняў, як правіла, становіцца калідор. Пагадзіцеся, не самая прыстасаваная для гэтага прастора. Ды і канфлікты з суседзямі, якім не падабаюцца шум і дзіцячыя крыкі, пры гэтым не рэдкасць.

Таму і ўзнікла ідэя адкрыць у інтэрнатах пакоі, прыстасаваныя для дзіцячага вольнага часу. Праект «Калідорныя дзеці» дазваляе вырашыць гэтыя праблемы.

Быццам бы такая простая думка, але дзякуючы праекту, які нарадзіўся з яе, «калідорныя дзеці» ў некалькіх інтэрнатах краіны ўжо не бегаюць па калідорах, а займаюцца ў спецыяльна абсталяваным пакоі, дзе ёсць умовы як для рухомых, так і для інтэлектуальных гульняў, для хобі і стасункаў.

Праект падтрымалі гарадскія ўлады і аб'яднанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. На Міншчыне ён рэалізуецца ў Жодзіне і Маладзечне і быў у ліку іншых прадстаўлены на абласным міжведамасным семінары па пытаннях рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у праблемных сем'ях», які адбыўся 20 лістапада ў Маладзечне.

Акрамя гэтага, удзельнікі міжведамаснага семінара — прадстаўнікі праваахоўных органаў, камісій па справах непаўналетніх гаррайвыканкамаў, супрацоўнікі аддзелаў адукацыі, ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, медыкі і іншыя абмеркавалі актуальныя пытанні па абароне правоў дзяцінства і абмяняліся вопытам сваёй работы.

Святлана БУСЬКО.

«ЕЎРАНЬЮС» РАСКАЖА ПРА II ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ ЎСЯМУ СВЕТУ

Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» і тэлеканал «Еўраньюс» заключылі дагавор аб інфармацыйным супрацоўніцтве. Подпісы пад дакументам паставілі дырэктар фонду Георгій КАТУЛІН і дырэктар па міжнародных продажах сусветна вядомага тэлеканала К'ел ШТАЙН.

Фота БелТА.

Паводле дагавора «Еўраньюс» вырабіць і размесціць у эфіры больш за 532 відэаролікі, прысвечаныя Беларусі ўвогуле і II Еўрапейскім гульням у прыватнасці. Акрамя таго, у эфір выйдуць і знаёмыя еўрапейскаму гледачу праграмы аб падарожжах і турыстычнай галіне — «Фокус», «Метраполітэн», «Паштоўкі», а таксама серыя спартыўных рэпартажаў аб падрыхтоўцы Мінска да маштабнай кантынентальнай падзеі «Дарога да...».

— *Сёння мы адкрываем новую старонку ў прасоўванні II Еўрапейскіх гульняў як у Еўропе, так і ў свеце ў цэлым. Раней Дырэкцыя падпісала пагадненні з шэрагам сродкаў масавай інфармацыі, аднак тэлеканал «Еўраньюс» сярод іх займае асаблівае месца. Аўдыторыя канала перавышае 400 млн тэлегледачоў, а праграмы транслююцца на 12 мовах. Акрамя таго, «Еўраньюс» мае яшчэ і інтэрнэт-рэсурс, які публікуе матэрыялы на дзевяці мовах. Усё гэта гарантуе шырокі ахоп аўдыторыі,* — лічыць Георгій Катулін. — *Наша супрацоўніцтва з вядомым тэлеканалам таксама абумоўлена паспяховай практыкай прасоўвання ім I Еўрапейскіх гульняў у Баку і Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестываляў у Тбілісі і Дзьёры. Тыя рэпартажы мелі станоўчы водгук з боку спецыялістаў спорту, балельшчыкаў і СМІ.*

Дырэктар фонду таксама адзначыў, што ўзаемадзеянне з «Еўраньюс» — не проста канал перадачы інфармацыі, а творчае супрацоўніцтва, паколькі эфірныя матэрыялы будуць распрацоўвацца сумеснымі намаганнямі. Гэта вельмі важна з пункту гледжання абмену вопытам і спадчыны Гульняў. Такое супрацоўніцтва дасць магчымасць выйсці на іншы ўзровень работы па асвятленні многіх значных мерапрыемстваў, якія плануецца правесці ў краіне, прычым не толькі спартыўных.

— *Для нас вы ўстанавілі высокую планку,* — падкрэсліў К'ел Штайн. — *той жа час гэта вялікі гонар і бясцэнны вопыт работы ў такім маштабным праекце, як II Еўрапейскія гульні.*

Тэлеканал «Еўраньюс» зробіць для беларускага боку два ролікі «Дарога да...» перад стартам Еўрапейскіх гульняў. Сюжэты раскажуць пра арэны, Вёску спартсменаў, а таксама аб спадчыне, якую пакінуць пасля сябе Еўрапейскія гульні. Карэспандэнт тэлеканала сустрэнецца з атлетамі незадоўга да старту форуму, наведае трэніроўкі і задасць пытанні аб іх мэтах на II Еўрапейскіх гульнях, аб трэніровачным працэсе. А дзевяць штодзённых рэпартажаў асветляць вынікі спаборніцтваў, цырымоніі адкрыцця і закрыцця. Аднаго са сваіх спартыўных журналістаў на час правядзення Гульняў тэлеканал камандзіруе ў Мінск.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

НЕ МАЕ АНАЛАГАЎ!

Арыгінальны супрацьпухлінны прэпарат «Тэмадэкс», распрацаваны навукоўцамі Белдзяржуніверсітэта, выйдзе на фармацэўтычны рынак Паўднёвай Амерыкі.

Урачы-нейрахірургі з пяці клінік Калумбіі сустрэліся з кіраўніцтвам БДУ. У склад дэлегацыі, якая наведала беларускую ВНУ, увайшлі спецыялісты па вывучэнні, абследаванні і лячэнні розных формаў анкалагічных захворванняў. У рамках афіцыйнага візіту ў Беларусь спецыялісты прынялі ўдзел у правядзенні аперацыі ў Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска з выкарыстаннем «Тэмадэкса». Правялі яе прафесар кафедры нервовых і нейрахірургічных захворванняў БДМУ Аляксандр Фядулаў і ўрач-нейрахірург найвышэйшай катэгорыі Дзмітрый Вееўнік.

«Тэмадэкс» распрацаваны навукоўцамі НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ і вырабляецца на прадпрыемстве «Унітэхпрам БДУ». Прэпарат не мае сусветных аналагаў і ўяўляе сабой гідрагелевую тэрапеўтычную сістэму для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных пухлін галаўнога мозга. Ён прымяняецца для знішчэння ракавых клетак, якія засталіся пасля правядзення хірургічнай аперацыі, і прадухіляе рэцыдывы: даказана, што лекавы сродак павялічвае працягласць жыцця пацыента. У найбліжэйшы час плануецца абмеркаваць дэталёвыя пытанні па пастаўцы прэпарату ў калумбійскія клінікі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Калумбійскія медыкі зацікавіліся беларускім прэпаратам супраць раку

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прадстаўнік Паўднёвай Карэі стаў новым прэзідэнтам Інтэрпола

Прадстаўніка Паўднёвай Карэі Кім Чон Яна абралі новым прэзідэнтам Інтэрпола, гаворыцца ў Twitter арганізацыі. Галасаванне прайшло на 87-й сесіі генеральнай асамблеі арганізацыі ў Дубаі. Акрамя Кім Чон Яна, на пасаду прэтэндаваў генерал-маёр расійскага МУС Аляксандр Пракапчук, які займае пасаду віцэ-прэзідэнта Інтэрпола па Еўропе. Выбары новага кіраўніка ведамства абвясцілі пасля таго, як у кастрычніку падаў у адстаўку ранейшы прэзідэнт Міжнароднай крымінальнай паліцыі Мэн Хунвэй. Ён знік у канцы верасня, пазней яго знайшлі ў Кітаі, дзе супраць яго распачалі справу аб карупцыі. Пасля сыходу Хунвэя ў адпаведнасці з правіламі часова выконваючым абавязкі прэзідэнта Інтэрпола стаў Кім Чон Ян, які раней займаў пасаду старшага віцэ-прэзідэнта арганізацыі. Як адзначае BBC, на самай справе, прэзідэнт Інтэрпола ў значнай ступені сімвалічная пасада. Аператыўнае кіраўніцтва арганізацыяй і каардынацыю паміж краінамі — членамі ажыццяўляе іншы орган — генеральны сакратарыят. Ім з 2014 года кіруе прадстаўнік Германіі Юрген Шток.

Падчас выбуху на сустрэчы багасловаў у Кабуле загінула звыш 50 чалавек

Звыш 50 чалавек загінула і больш чым 80 атрымала раненні ў выніку выбуху ў палацы шлюбаў у Кабуле, дзе вядомыя святары сабраліся на свята ў гонар дня нараджэння прарока Мухамеда. Выбух адбыўся ў банкетнай зале. Як перадае тэлеканал Tolo News, у той момант у зале знаходзілася каля тысячы чалавек. Як мяркуецца, выбуховае прыстасаванне прывёў у дзеянне смяротнік. Аб гэтым са спасылкай на прадстаўніка МУС Афганістана паведаміла агенцтва Рэйтэр. Прадстаўнік палаца шлюбаў, памяшканні якога выкарыстоўваюцца для палітычных і рэлігійных сходаў, паведаміў агенцтву Франс прэс, што смяротнік падарваў сябе, прабраўшыся ў гушчу людзей. Па колькасці ахвяр гэта адзін з самых буйных нападаў у Афганістане за апошнія месяцы.

У кастрычніку хваля гвалту пракацілася па краіне падчас парламенцкіх выбараў. Напады і выбухі ў Афганістане рэгулярна здзяйсняюць прадстаўнікі тэрарыстычных груповак «Талібан» і «Ісламская дзяржава». Паводле рашэння прэзідэнта Афганістана, 21 лістапада быў абвешчаны днём жалобы.

Выяўлена жыллё тэрмітаў памерам з Вялікабрытанію

У Бразіліі навукоўцы выявілі гіганцкую сістэму тэрмітнікаў, плошча якой супастаўная з плошчай Вялікабрытаніі. Даследаванне апублікавана ў навуковым часопісе Current Biology. Каманда біёлагаў з Бразіліі, Вялікабрытаніі і ЗША пад кіраўніцтвам энтамолага Стывена Марціна з брытанскага ўніверсітэта Солфарда выявіла тэрмітнікі на паўночным усходзе паўднёваамерыканскай краіны, у кааціngу — сухім лесе. Вышыня тэрмітнікаў складае каля двух з паловай метраў, а дыяметр у падножжа — прыкладна дзевяць метраў. 200 мільёнаў пагоркаў размешчаны ў шахматным парадку на адлегласці каля 20 метраў адзін ад аднаго. Усяго тэрмітнікі займаюць плошчу ў 230 тысяч квадратных кіламетраў. Для параўнання: плошча Вялікабрытаніі складае 242,5 тысячы квадратных кіламетраў. Біёлагі палічылі гэтую сістэму самай буйной на Зямлі. Навукоўцы мяркуюць, што кузуркі віду Syntermes dirus жывуць не ў саміх пагорках, а ў тунэлях пад зямлёй. Тэрміты, памер якіх складае каля аднаго сантыметра, выкідвалі лішнюю глебу на паверхню, так і з'явіліся шматлікія кучы. Усяго яны дасталі каля 10 кубічных кіламетраў зямлі, што супастаўна з аб'ёмам чатырох тысяч пірамід у Гізе. На гэтую работу ў насякомых сышло каля 3,8 тысячы гадоў. Марцін заклікаў прызнаць сістэму тэрмітнікаў прыродным цудам свету. Ён адзначыў, што энтамолагам пакуль не ўдалося выявіць месцазнаходжанне каралевы тэрмітаў. Тым не менш яны ўпэўненыя, што сістэма тэрмітнікаў дагэтуль населеная.

Культасвета

Увесь гэты джаз

Міжнародны фестываль JAZZinMinsk збярэ сусветна вядомых выканаўцаў

22—25 лістапада на пляцоўках Палаца прафсаюзаў і Палаца Рэспублікі пройдзе ўжо сёмы Міжнародны джазавы фестываль JAZZinMinsk, які дазволіць публіцы пачуць жыўцом найлепшых выканаўцаў з ЗША, Бразіліі, Нідэрландаў, Іспаніі, Францыі, Латвіі, а таксама — упершыню — афра-карыбскі аркестр музыкантаў з Марцінікі, Пуэрта-Рыка, Гаіці, Трынідада, Ямайкі і Антыгуа. У праграме — некалькі дзясяткаў імёнаў, у тым ліку зоркі балтыйскага джаза Эвеліны Пратэкторэ, вядомага ўсяму свету па фільме «Браты Блюз» саксафаніста Уіла Полака з Канзас-Сіці, выдатнага гітарыста Элісеа Ларэда, легендарнага спевака, флейтыста, саксафаніста і бубнача Дэдэ Сен-Пры, які сумяшчае тытулы найлепшага музыкі Афрыкі і рыцара Ганаровага легіёна Францыі...

«Мінск — сапраўдная сталіца сусветнага джаза!» — сцвярджае кіраўнік Джаз-клуба і музыкант Яўген Уладзіміраў, прадстаўляючы фэст. У якасці доказу выконвае на ўнікальным клавішным трамбоне некалькі пазнавальных мелодый і нагадвае, што ўжо больш як 15 гадоў у Палацы прафсаюзаў штомесяц праходзяць канцэрты так званага джазавага абанемента, а фестываль, як флагманскі праект, збірае добрую сотню знакамітых джазменаў з усяго свету.

«Часта гавораць, што джаз — музыка чорных. Але ў нас выступаюць і чорныя, і белыя, і жоўтыя, і абсалютна ўсякія музыканты, суцэльны інтэрнацыянал, які дэманструе, што джаз — музыка, якой падуладныя ўсе кантыненты», — гаворыць старшыня аргкамітэта фестывалю, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір Карагін. Дзякуючы яму фестываль мае падтрымку з боку як дзяржаўных, так і бізнес-структур, ад Міністэрства замежных спраў і Мінінфармацыі да «Белавія» і аўтамабільных брэндаў. Мінскі фэст выклікае ўвагу мноства замежных слухачоў. Сёлета, напрыклад, спецыяльна прыедзе публіка з Фінляндыі, Швецыі, Польшчы, Латвіі і Украіны, якая жадае і пачуць знакамітых джазменаў, і наладзіць бізнес-сувязі з беларускімі прадпрымальнікамі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Будзь у курсе!

У ЦЯГНІК — З ВЕЛАСІПЕДАМ

Беларуская чыгунка правядзе абсталяванне месцаў для правозу веласіпедаў у цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа з ненумараванымі месцамі, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

На першапачатковым этапе месцамі для правозу двухколавых машын абсталююцца два саставы: электрацягнік ЭР9 і дызель-цягнік ДР1А ў галаўных вагонах (для трох веласіпедаў у кожным вагоне). Устаноўленыя на рухомым саставе канструкцыі пройдуць выпрабаванні трываласці мацавання. У далейшым месцамі для правозу веласіпедаў плануецца абсталяваць увесь маторавагонны рухомы састаў рэгіянальных ліній эканом-класа.

Таксама ў планах Беларускай чыгункі абсталяванне гэтага рухомага саставу адмысловымі месцамі для правозу буйнагабарытнай ручной паклажы. Усе работы плануецца зрабіць пры правядзенні планавых рамонтаў рухомага саставу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 26.12.2018 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 623/С-58052, общей площадью 915,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Узда, ул. Карла Маркса, 130Д. Назначение: столярно-плотницкая мастерская, наименование: 2 99 99 здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625650100002000260 площадью 1,0930 га. **Начальная цена продажи – 194 400,00 рубля, задаток – 19 440, 00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 211/С-6151, общей площадью 405,6 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Миоры, ул. Коммунистическая, 47. Назначение: материальный склад, наименование: материальный склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 223350100001000292 площадью 3,0611 га. **Начальная цена продажи – 43 243,20 рубля, задаток – 4 324,32 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-97391, общей площадью 92,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, 11П. Назначение: здание специализированное для бытового обслуживания, наименование: прачечная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001009879 площадью 0,0183 га. **Начальная цена продажи – 35 370,00 рубля, задаток – 3 537,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ

Аукцион состоится 26.12.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 26 декабря 2018 года.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений: 20.12.2018 в 14.00.

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента в любое время до объявления его проданным

Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63

СМАРТФОН — НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЎНУКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А яшчэ, напрыклад, можна спампаваць праграму з раскладам руху транспарту, і вы заўсёды будзеце ведаць, калі адпраўляецца патрэбны вам аўтобус, тралейбус альбо трамвай ці праз колькі хвілін ён прыбудзе на ваш прыпынак. А заўзятыя грыбнікі з дапамогай інтэрнэту проста ў лесе змогуць удакладніць: есці гэты грыб ці лепш трымацца ад яго далей. І гэта яшчэ не кажучы пра мноства карысных дробязяў накшталт будзільніка, ліхтарыка, калькулятара, компаса і г. д.

Іншая справа, што сярод пенсіянераў ёсць шмат тых, хто асцерагаецца новых мабільных прылад, баіцца націснуць там на нешта лішняе і зламаць, хоць гэта ў сучасных разумных тэлефонах выключана. Таму здараецца, што нават калі пажылому чалавеку дзеці ці ўнукі падарылі смартфон, ён выкарыстоўвае яго як просты тэлефон. Не стварае акаўнт пры першай настройцы тэлефона, не ўсталёўвае сучасныя праграмы. Ёсць нават людзі, якія баяцца заходзіць у налады тэлефона, каб нешта ўключыць або адключыць, таму што баяцца ўсё сапсаваць.

Мы пагаварылі з двума мінчанамі ва ўзросце, якія карыстаюцца магчымасцямі разумных тэлефонаў і раяць усім паспрабаваць.

Галіна СНЫТКІНА, 74 гады:

— Я два месяцы таму купіла ў растэрміноўку смартфон. На старым тэлефоне клавіятура ўжо цалкам сцерлася, і я не магла яго выкарыстоўваць. Але я ўмела ў тэлефоне карыстацца толькі кантактамі — і больш нічога. Не магла набраць СМС, не ўмела працаваць з тэлефонам у інтэрнэце, з электроннай поштай.

Я спрабавала асвоіць інструкцыю, але для мяне ў ёй было замала інфармацыі. Ведаеце, у нашым узросце ўжо трохі запаволеная рэакцыя, раней я хутчэй засвойвала новае...

Я, вядома, падыходзіла да дачкі, да зяця, але ім лягчэй проста выканаць патрэбную аперацыю. Яны казалі: «Дай, я зраблю», — і ўсё. Вядома, калі ў мяне былі цяжкасці, яны прыходзілі на дапамогу, але, каб тлумачыць, як там усё ўладкавана, патрабуюцца цярпенне і час. І тут я ўбачыла аб'яву, што Цэнтр актыўнага даўгалецця запрашае на курсы па навучанні карыстанню смартфонам, і запісалася на іх.

Там мяне навучылі і падключаць Wi-Fi, і перапісвацца з сябрамі з дапамогай электроннай пошты, і бясплатна тэлефанаваць па Viber і Skype. Гэта вельмі зручна: я маю сувязь з усімі ў любы момант, заўсёды, нават у дарозе, магу атрымаць патрэбную інфармацыю. Нядаўна з сямігадовым унукам хадзілі ў батанічны сад, я там сфатаграфавала мноства хрызантэм, лебедзяў на сажалцы і тут жа паслала гэтыя здымкі сяброўцы. Там было так прыгожа!

Хоць для майго хобі смартфон не вельмі падыходзіць. Я займаюся вывучэннем гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Тут ужо патрэбна Нацыянальная бібліятэка, і я туды рэгулярна езджу. Але і ў інтэрнэце таксама шукаю інфармацыю, якая цікавіць мяне і дае мне новыя веды.

Аляксей ГЕРМАНОВІЧ, 81 год:

— Я займаўся канструктарскай і навукова-даследчай работай, сфера маіх інтарэсаў — ветраўстаноўкі. З 2011 года я ўжо не працую, але ў мяне ёсць намер напісаць кнігу па сваёй рабоце. Камп'ютарам я валодаю, а дзесьці 4-5 гадоў таму ў мяне з'явіўся планшэт. Ён невялікі, кішэннага тыпу, яго зручна насіць з сабой. Я зараз вольны чалавек, шмат езджу не толькі па Мінску, але і па краіне.

Многія цяпер асвойваюць розныя дэвайсы, яны вельмі зручныя ў бытавым плане, для зносін. Можна тэлефанаваць бясплатна сваякам, знаёмым, а калі па Skype, то там ёсць відэасувязь — можна бачыць чалавека, з якім размаўляеш. Але мне бытавы ўзровень іх выкарыстання не вельмі цікавы.

Мне ў свой час, калі працаваў, даводзілася ездзіць у Маскву ў публічную бібліятэку, каб прагледзець замежныя навуковыя часопісы, азнаёміцца з цікавай для мяне навуковай інфармацыяй. Цяпер з развіццём інтэрнэту многія крыніцы інфармацыі можна атрымаць не выходзячы з дому бясплатна або за невялікую плату. Гэта самае вялікае дасягненне апошняга часу, я лічу. Ну, ва ўсякім разе, для мяне.

Зараз у сусветным сеціве ёсць і электронныя альбомы мастакоў. Творы маіх любімых імпрэсіяністаў можна глядзець на экране, у тым ліку і на вялікім, калі падключыць да тэлевізара, у вельмі добрай якасці. Можна захоўваць іх у сябе, і яны будуць даступныя ў любы момант.

У мяне ёсць хобі — гэта лодкі, адпачынак на вадзе, рыбалка. Часам літаральна на хаду трэба атрымаць нейкую інфармацыю, звесткі з інтэрнэту. А летам практычна жывеш на лецішчы, але, вядома, камп'ютар з сабой туды не павязеш. Планшэт — найлепшае рашэнне ў гэтым выпадку. Па ім і фільм можна паглядзець, і канцэрт — ён вельмі разнастаіць жыццё. А вось тэлефон у мяне самы звычайны, толькі што з фотакамерай, якая дазваляе сфатаграфаваць, напрыклад, расклад электрычкі, каб не запісваць.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Дэвайсы — вельмі карысная рэч для ўсіх, акрамя хіба што малодшых школьнікаў, якія занадта захапляюцца гульнямі. На жаль, знайсці залатую сярэдзіну ў гэтым пытанні не ўсім бацькам удаецца...

Святлана БУСЬКО.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 7 декабря 2018 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	Автомобиль **УАЗ 3741 94-310**, рег. № **АВ 6394-3**, г. в. **2008**, цвет – голубой с белой полосой, тип ТС – грузовой фургон, состояние – на ходу. **Адрес:** г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 14	**360,59**	36,06
2	Автомобиль **ГАЗ 2705**, рег. № **АА 0374-3**, г. в. **2004**, цвет – светло синий, тип ТС – грузовой фургон, состояние – на ходу. **Адрес:** г. Гомель, пр. Речицкий, 9а	**376,68**	37,67
3	Автомобиль **УАЗ 390994**, рег. № **АВ 4582-3**, г. в. **2008**, цвет – синий, тип ТС – грузопассажирский фургон, состояние – на ходу. **Адрес:** г. Ельск, ул. Ленинская, 6	**399,91**	39,99
4	Автомобиль **ГАЗ 2705**, рег. № **ЕС 8954**, г. в. **2004**, цвет – синий, тип ТС – грузовой фургон, состояние – не на ходу. **Адрес:** г. Калинковичи, ул. Волгоградская, 118	**376,68**	37,67
5	Автомобиль **ГАЗ 2705**, рег. № **АА 9682-3**, г. в. **2007**, цвет – голубой, тип ТС – грузопассажирский фургон, состояние – не на ходу. **Адрес:** г. п. Лельчицы, ул. Советская, 32	**343,33**	34,33
6	Автомобиль **УАЗ 3909**, рег. № **АА 4122-3**, г. в. **2006**, цвет – синий с белой полосой, тип ТС – грузопассажирский фургон, состояние – на ходу. **Адрес:** г. п. Лоев, ул. Ленина, 25	**264,11**	26,41
7	Автомобиль **ВАЗ 2106**, рег. № **8352 ЕН-3**, г. в. **2000**, цвет – серо-зеленый металлик, тип ТС – легковой специальный седан, состояние – не на ходу. **Адрес:** г. п. Октябрьский, ул. Дзержинского, 45	**156,57**	15,66
8	Автомобиль **УАЗ 3909**, рег. № **АІ 4986-3**, г. в. **не определен**, цвет – голубой, тип ТС – грузопассажирский фургон, состояние – не на ходу. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66	**270,16**	27,02
9	Автомобиль **ГАЗ 3110**, рег. № **7621 НХ**, г. в. **2000**, цвет – зелено-синий, тип ТС –легковой специальный седан, состояние – на ходу. **Адрес:** г. Светлогорск, ул. Ленина, 34	**276,66**	27,67
10	Автомобиль **УАЗ 39099 4**, рег. № **7621 НХ**, г. в. **2007**, цвет – светло-голубой, тип ТС – грузопассажирский фургон, состояние – на ходу. **Адрес:** г. п. Хойники, ул. Советская, 68	**350,37**	35,04
11	Автомобиль **ГАЗ 2705**, рег. № **АВ 1787-3**, г. в. **2007**, цвет – голубой с белой полосой, тип ТС – грузовой специальный фургон, состояние – на ходу. **Адрес:** г. п. Октябрьский, ул. Дзержинского, 45	**325,83**	32,58

Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 79-67-44, 8 (029)150-98-09, Гроховская Ольга Эдуардовна – инженер ОЭЗ и С Гомельского филиала РУП «Белпочта». **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **22 ноября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 5 декабря 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 01.09.2018 г. № 168 (28784). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

ЛОТ № 1	Изолированное помещение с инв. № 500/D-70773791, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62-1. Площадь – 876,2 кв. м. Наименование – помещение общественного питания. Назначение – помещение общественного питания; изолированное помещение с инв. № 500/D-70773792, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62-2. Площадь – 5518,5 кв.м. Наименование – помещение многофункциональное. Назначение – помещение многофункциональное; изолированное помещение с инв. № 500/D-70773793, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62, пом. 3. Площадь – 469,6 кв. м. Наименование – помещение многофункциональное. Назначение – помещение многофункциональное; сети водопровода; лифт грузовой; лифт грузовой; подпорная стена; автодороги; кран передвижной «Пионер»; хозфекальная канализация; дождевая канализация; сети канализации; трансформаторная подстанция; конденсаторная установка АКБ-220КВАР; конденсаторная установка АКБ-220КВА; пункт распределения ПР-24; счетчик холодной воды ДУ 80. Изолированные помещения входят в состав капитального строения с инв. № 500/С-536, наименование – здание столовой лит. М3/к, площадь – 7363,3, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000006008765, площадью 0,6251 га, предоставленного ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). Объекты недвижимости обременены договорами аренды. На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,1086 га; охранная зона электрических сетей, площадь 0,0127 га; Условия дальнейшего использование объектов – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска. Имущество имеет обременения. Продавец обязуется снять обременения до момента регистрации договора купли-продажи с покупателем
Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN	10 644 783 руб. 00 коп.
Задаток, BYN	1 064 478 руб. 30 коп.
Шаг аукциона	5 %
Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны	ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел. 8 017 284 94 32, факс 8 017 286 76 80
Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны	ОАО «МПОВТ» 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62, тел. 8 017 3636230, факс 8 017 201 41 39
Сведения о представителях Продавца для осмотра/ознакомления с предметом аукциона	Начальник отдела недвижимости ОАО «МПОВТ» Грунтова Александра Петровна, тел. +375 44 580 63 02
Срок подписания договора купли-продажи	Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона	Победитель аукциона в течение **3 (трех) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона
Условия оплаты	Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях на следующие банковские реквизиты: р/с BY54 BELB 3012 0007 9002 0022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код BELBBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 29. Получатель – открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка производится нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие банковские реквизиты: в белорусских рублях: р/с BY54 BELB 3012 0007 9002 0022 6000 (BYN) в ОАО «Банк БелВЭБ», код BELBBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 29. Получатель – открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона
Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе	Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 18 декабря 2018 года** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 306
Место, дата и время проведения аукциона	Аукцион состоится **22 декабря 2018 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

Дополнительная информация по тел. +375 17 284 94 32.
Email: arenda@horizont.bn.by

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ № 0679247 **считать недействительным.**

УНП 100122726

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

22 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15853)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Гурт «PRAвакацыя»:

«АДЗІН ГОЛАС ДОБРА, А ДВА — ЯШЧЭ ЛЕПШ!»

Спачатку кожны з іх марыў стаць вядомым салістам, а зараз яны ў складзе дуэта разам скараюць музычныя вяршыні. Арцём САЛАДУХА і Марк ВОЙТКА вось ужо тры гады спяваюць у гурце «PRAвакацыя», радуюць публіку новымі хітамі і не збіраюцца спыняцца на дасягнутым поспеху. Дарэчы, калектыў у 2016 годзе быў прызнаны найлепшым беларускім поп-гуртом па версіі музычнага тэлеканала «RUTV: Беларусь» і па выніках народнага галасавання.

— Як утварылася «PRAвакацыя»?

Марк Войтка:

— Усё пачалося вясной 2015 года. Ніякіх кастынгаў не было. Мы проста пераможцы па жыцці. *(Смяюцца.)* Нам пашанцавала сустрэць прадзюсара Анатоля Чэпікава, ну, дакладней гэта ён сустрэў нас на канцэрце ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і прапанаваў паспрабаваць пасупрацоўнічаць.

— У назву гурта ўкладзены нейкі таемны сэнс?

Арцём Саладуха:

— Насамрэч усё вельмі проста. Сваёй музыкай мы імкнёмся правакаваць усіх людзей на танцы і добры настрой. А вось самі на правакацыі стараемся не паддавацца.

— Вы памятаеце сваё першае сумеснае выступленне?

Арцём Саладуха:

— Вядома, такое, як нам здаецца, заўсёды запамінаецца. Наша першае выступленне з вялікай праграмай прайшло на Дні горада ў Наваполацку 12 ліпеня 2015 года, праз два месяцы пасля заснавання калектыву. Мы моцна хвалявaліся, але дзякуючы добраму прыёму гледачоў усё прайшло выдатна. Эмоцыі зашкальвалі, было вельмі незвычайна адчуваць сябе артыстамі, якіх слухаюць тысячы людзей.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Хвіліна славы

«АДЦІСНУЦЬ» РЭКОРД

ЯК РАТАВАЛЬНІК ТРАПІЎ У КНІГУ ГІНЕСА

«Знакамітасць? Я сябе ёй не адчуваю. Жыву такім жа жыццём, як і раней, — трэніроўкі і работа па раскладзе», — кажа Яўген ЛОСЬ, пажарны-ратавальнік з Бабруйска. У лістападзе ён трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса. За хвіліну хлопец змог адціснуцца на брусах 67 разоў з дадатковай вагой 18,2 кілаграма.

Па першай адукацыі Яўген — тэхнік-электрык. Скончыў каледж, два гады адпрацаваў на будоўлі. І сышоў: не яго гэта. Будучую прафесію хлопец захацеў звязаць са спортам. Паступіў на факультэт фізічнага выхавання БДПУ імя Максіма Танка. А ў 2012 годзе прыйшоў у пажарную часць — па экстрым і працу на карысць грамадства.

Свой першы выклік выразна памятае дагэтуль:

— Я тады яшчэ курсантам быў, «на тэлефоне» сядзеў. Прыйшло паведамленне: пажар на вуліцы Чапаева. Быў позні вечар, мы аддзяленнем выехалі на месца, а там дом гарыць адкрытым полымем, шыфер страляе. Я глядзеў на калег — для іх гэта была звычайная справа, яны не мітусіліся. А ў мяне эмоцый «вышэй даху», столькі лішніх рухаў было... Бегаў, ва ўсіх пытаўся, што мне рабіць, што браць.

Вопыт прыйшоў хутка. Як і звычка быць заўсёды напагатове, нават у паўсядзённым жыцці. Праўда, жонка і бацькі за Жэню ўсё роўна хвалююцца, таму пасля выклікаў ён заўсёды перазвоньвае родным, каб сказаць, што ўсё добра.

Спортам хлопец займаецца яшчэ са школьных гадоў. Хадзіў з сябрамі на турнікі, вучыўся выконваць трукі.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Нечакана!

КАБ ЖЫЛІ САМАЛЁТЫ Ў ПАЛЁТАХ

На зямлі іх абслугоўвае авіятэхнік-дзяўчына

У кампаніі «Белавія» Вольга ВЕНСКАЯ працуе чатыры гады. Гэта невысокая зграбная дзяўчына мяняе маторы, фільтры, масла. Яе рэдка можна ўбачыць з манікюрам, а ў тэлефоне няма ніводнага фота з самалётам: навошта, калі кожны працоўны дзень бачыш іх вельмі блізка?

Самалёты Вольга палюбіла ў 16 гадоў — пасля скачка з парашутам. На аванцюру падбіла сяброўка — дзяўчына пагадзілася пайсці з ёй за кампанію. Праўда, думала, што абмяжуецца толькі заняткамі, а як справа дойдзе да самога скачка, пастаіць збоку, бо баялася вышыні. «Калі села ў самалёт, сказалі, што зваротнага шляху няма: спусцішся толькі з парашутам», — з усмешкай успамінае Вольга. Скакала яна, дарэчы, тройчы — з вышыні 800 і 1000 метраў. Прызнаецца, што першы раз аказаўся самы просты, бо не ведаеш, чаго чакаць. А вось на трэці было страшна: пакуль дзяўчына ўзнімалася ў паветра на самалёце, дрыжалі калені.

Пасля школы мінчанка хацела паступаць вучыцца на лётчыка, але ў ваенную акадэмію не прайшла па здароўі. Тады выбрала ў Мінскім дзяржаўным вышэйшым авіяцыйным каледжы спецыяльнасць «Тэхнічная эксплуатацыя паветраных суднаў і рухавікоў». У сваёй групе Вольга была адзінай дзяўчынай.

— Дыскамфорту сярод хлопцаў я не адчувала, бо ў дзяцінстве праводзіла канікулы ў бабулі разам з братамі, — дзеліцца яна.

Вучоба давалася нескладана. «Калі ёсць жаданне, то ўсё атрымаецца. А калі няма — будзеш хадзіць і скардзіцца, якія дрэнныя выкладчыкі», — жартуе суразмоўніца.

Выбар месца працы ў авіятэхнікаў у нашай краіне невялікі: аэраклубы, Мінскі і Аршанскі авіярамонтныя заводы, кампанія «Трансавіяэкспарт», якая займаецца грузавымі перавозкамі. Вольга па размеркаванні трапіла ў «Белавія»: вельмі хацела менавіта туды.

Разам з ёй у змене працуе чалавек 20. Усе мужчыны.

Фота Яўгеніі НІКІФАРАВАЙ.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
22 11 2018 г.

Маладыя і амбіцыйныя

АДКРЫЦЬ БІЗНЕС У... 14 ГАДОЎ

Як стаць паспяховым, багатым і знакамітым?

«Мары здзяйсняюцца заўсёды, не здзяйсняюцца толькі нашы ілюзіі. Праца мары зусім неабавязкова чакае вас на выхадзе з універсітэта. Пытайцеся ў сябе мільён разоў, чаго вы насамрэч хочаце, і будзьце шчырымі самі з сабой», — такой парадай падзяліліся з удзельнікамі дзелавой канферэнцыі для падлеткаў «GURU Будучыні» трэнер TeenGuru Business Academy 22-гадовая Паліна БАЛАБАНАВА. Мерапрыемства прайшло ў рамках Сусветнага тыдня прадпрымальніцтва ў Беларусі, а яго спікерамі сталі школьнікі і студэнты, якія, нягледзячы на свой малады ўзрост, могуць даць фору многім дарослым: сярод іх былі юныя вынаходнікі, пераможцы конкурсаў тэхнічнай і інжынернай творчасці, робататэхнікі, аўтары IT-праектаў, YouTube-блогеры і нават юныя бізнесмены.

Цімафей Галянтаў: «Мне сказалі: «Хлопчык, пазвані, калі споўніцца 18...»

Задаваць правільныя пытанні

Напрыклад, Паліна Балабанава стала коўчам у 20 гадоў: за два гады сваёй самастойнай «працоўнай дзейнасці» яна правяла ўжо больш як 80 трэнінгаў, стварыла пяць унікальных трэнінгавых праграм.

— Я заўсёды ведала, кім хачу быць: калі мне было сем гадоў, сказала, што буду настаўніцай англійскай мовы, у 10 гадоў вырашыла, што буду спявачкай і артысткай, спачатку хуценька выйграю дзіцячае «Еўрабачанне», а потым замахнуся і на дарослае, — жартуе дзяўчына. — У 13 гадоў паглядзела французскія мюзіклы і заявіла маці, што мне трэба абавязкова вывучыць французскую мову, бо я паеду ў Францыю паступаць на рэжысёра мюзіклаў. У 15 гадоў думала, што буду архітэктарам, потым планавала стаць праграмістам, а ў 11-м класе ўпэўнена рыхтавалася да паступлення на «сусветную эканоміку», але ў красавіку рэзка перадумала, змяніла абодва прадметы для здачы ЦТ і паступіла на «менеджмент» у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. На пешым курсе вырашыла, што буду музыкальным прадзюсарам, таму што трэба ўзнімаць на новы ўзровень беларускі шоу-бізнес. А на трэцім курсе перад днём нараджэння бацькі запыталіся ў мяне, які падарунак я хачу атрымаць? У мяне былі два варыянты — аўташкола і курсы коўчынгу. Хто не ведае, коўч — гэта той чалавек, якія дапамагае іншым дасягаць мэт і распрацоўваць для гэтага стратэгіі, выходзіць на новыя ўзроўні, змагацца са сваімі ўнутранымі страхамі. Мне было 19 гадоў, а ўсе ў групе — старэйшыя за мяне, таму глядзелі такімі вялікімі вачыма. Але вельмі хутка я пераканалася, што ўсё ў мяне атрымліваецца не горш, чым у іншых аднагрупнікаў, больш за тое, мне гэта вельмі падабаецца. У выніку я атрымала сертыфікат коўча ў 20 гадоў і вырашыла, што менавіта коўчынгам і хачу займацца. Прайшло два гады, я праваджу заняткі і адчуваю сябе на сваім месцы.

Паліна ўпэўнена, што, калі не ведаеш, чым хочаш займацца ў жыцці, трэба спрабаваць усе заняткі запар:

— Па-першае, любы набыты вопыт назапашваецца і можа аказацца вельмі карысным у самы нечаканы і важны момант. Па-другое, калі ў вас ёсць пытанне, вы на яго абавязкова атрымаеце адказ: у прачытанай кнізе, пры праглядзе фільма, падчас сустрэчы з нейкім чалавекам ці прачытаеце штосьці важнае ў інтэрнэце. Галоўнае — сфакусіравацца на пытанні. Але здараецца, што ёсць вы і ёсць ваша мэта, а паміж вамі ўзнікае лянота. Можна паддацца ёй і адкласці сваё жаданне на нявызначаны тэрмін, а можна пачаць з лянотай змагацца. Гэта найгоршая ідэя з усіх. Калі мы хварэем, то можам прыняць таблетку і «збіць» тэмпературу, але апошняя — толькі сімптом, які ўказвае на існаванне нейкай праблемы. Лянота — таксама сімптом, таму больш правільна будзе да яе прыслухацца.

Паліна Балабанава: «Калі ў вас ёсць пытанне, вы на яго абавязкова атрымаеце адказ».

Упэўнена, што многія спрабавалі распачаць новае жыццё з панядзелка, а ўжо ў аўторак жаданне знікала. Гэта адбываецца таму, што вы прынялі таблетку ад лянoты, але яна не лечыць вашу хваробу... А калі мы прыслухаемся да яе, то, магчыма, зразумеем, што проста стаміліся. У такім выпадку можна выспацца, паглядзець добры фільм, пакамунікаваць з блізкімі людзьмі і вярнуцца зноў да паўнавартаснага жыцця. Але ёсць і другі варыянт: вы пакутуеце ад таго, што не разумееце, навошта гэта ўсё робіце, у вас адсутнічае глыбінная матывацыя. Таму трэба вучыцца слухаць сябе.

«Многім знаёмая сітуацыя, калі мы заходзім у «Інстраграм» у акаунт да вядомага чалавека, напрыклад, да вядомай спявачкі, і разважаем прыкладна так: у яе шмат «лайкаў», яна раздае інтэрв'ю, носіць брэндавыя рэчы, і я хачу быць такім жа паспяховым, як яна. Давайце падумаем, а чаго вы насамрэч жадаеце? — прапануе Паліна. — Не варта паддавацца ілюзіям. Стаць паспяховым і самарэалізавацца можна абсалютна ў любой сферы. Таму задавайце правільныя пытанні, настройвайце ваш «фокус», каб не прапусціць адказ, слухайце вашу ляноту, якая раскажа вельмі шмат карыснай інфармацыі пра вас...»

Ператварыць хобі ў работу

— Можа быць, кагосьці мой вопыт натхніць і заматывуе змагацца са сваімі праблемамі, — кажа **Ілья ГРОЗАЎ, студэнт чацвёртага курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ і інжынер-праграміст у кампаніі Rozum Robotics, двойчы фіналіст Сусветнай алімпіяды робатаў (WRO) у складзе нацыянальнай зборнай.** — Я вучыўся ў самай звычайнай школе. Настолькі звычайнай, што яна ў той час займала 22-е месца з 24 у нашым раёне. І да восьмага класа ўсё быццам бы і задавальняла, але потым мне «стрэльнула» ў галаву: я зразумеў, што хачу займацца фізікай і матэматыкай (аб праграмаванні я яшчэ не ведаў). І адразу пачаліся праблемы: у школе педагогаў, якія маглі б даць сур'ёзную базу па гэтых прадметах, не было. Таму я пачаў наведваць курсы ў рэпетытарскім цэнтры, займацца шмат сам. Так, перашкоды былі, але гэта не падстава, каб здавацца. Я знайшоў выйсце: паступіў у Ліцэй БДУ на фізіка-матэматычны профіль. Ліцэй — гэта найлепшыя два гады майго жыцця. Там я трапіў у цудоўны калектыў людзей, якія імкнуліся да самаразвіцця, да выдатных педагогаў. Пазнаёміўся з праграмаваннем, даведаўся, што мой аднакласнік яшчэ ў 9-м класе зарабляў нядрэнныя грошы, ствараючы праграмы на заказ, і гэта дало моцны штуршок для развіцця.

Пасля ліцэя паступіў на ФПМІ ў БДУ. Вельмі многаму навучыўся ў сваіх аднакурснікаў, якія ўжо працуюць: хто — у «Яндэксе», а хто — у кампаніях ПВТ. Ва ўніверсітэце вучаць вучыцца — і гэта, бадай што, галоўнае. Ёсць час, каб знайсці сваю нішу. Я, напрыклад, захапіўся робататэхнікай, хоць паспеў паспрабаваць свае сілы ў самых розных сферах праграмавання.

Да чацвёртага курса ты ўжо разумееш, што з большага можаш засвоіць усё сам, і застаецца толькі які-небудзь адзін карысны прадмет у семестры. Ты не хочаш хадзіць ва ўніверсітэт, бо працаваць нашмат цікавей.

Двойчы (у 2016 і 2017 гадах) Ілья ўдзельнічаў у складзе беларускай каманды ў Сусветнай алімпіядзе робатаў. І калі першы раз ён не вельмі разумеў, на што пагадзіўся, то на другі быў настолькі зацікаўлены, што адназначна падпісаўся б пад любым праектам у гэтай сферы.

«Робататэхніка знаходзіцца дзесьці на скрыжаванні тэарэтычных ведаў з самых розных галін. Ты павінен ведаць механіку, разбірацца ў электратэхніцы і праграмаванні. Трэба разумець, як апрацоўваць вялікія масівы даных — гэта вельмі цікавы і захапляльны працэс, — кажа Ілья. — Самае галоўнае — гэта рашэнне нетрывіяльных задач. Навыкі, атрыманыя на WRO, дапамагаюць мне сёння шукаць і засвойваць інфармацыю хутчэй».

З першай спробы ўдзелу ў Сусветнай алімпіядзе робатаў нашай камандзе ўдалося трапіць у топ-10 з 54 камандаў, што здолелі прабіцца ў фінал. А на другі год толькі крыўдная памылка не дазволіла ўзняцца на трэцюю прыступку. «Мы занялі восьмае месца, але ўсё з-за майго промаху, — усміхаецца хлопец. — Хоць у мяне ўжо ёсць правы, я пераблытаў «права» і «лева», і робат павярнуў не туды. Калі б не памыліўся, мы былі б трэція...»

Наступным важным этапам стаў удзел у хакатонах. Ілья Грозаў уваходзіў у склад камандаў-пераможцаў на хакатонах wth 2017, bsuir Studhack 2017, tech4life hack 2018. Менавіта там ён і пазнаёміўся са сваімі цяперашнімі работадаўцамі. «Напэўна, убачылі агонь у маіх вачах», — жартуе ён. Па выніках тэставага праекта стаў працаваць у кампаніі Rozum Robotics. Спачатку тры месяцы на выпрабавальным тэрміне, а затым і паўнапраўным членам каманды.

— Калі ваша хобі стане работай, вы не будзеце працаваць ні дня, таму шукайце тое, што вам па душы, імправізуйце і перамагайце, — раіць усім, хто яшчэ не вызначыўся з выбарам, паспяховы юнак.

Даказаць, што ты — самастойны

Цімафею ГАЛЯНТАВУ ідэя адкрыць свой бізнес у сферы продажу прыйшла... у 14 гадоў. Але аформіць усё афіцыйна на сябе ён не мог, таму звярнуўся па дапамогу да бацькі.

— Мы дамовіліся, што кіраваць бізнесам буду я, а 10 % ад прыбытку пойдзе яму, і ўсе былі задаволеныя, — смяецца юнак. — А гэтым летам я пайшоў на бізнес-курсы і там ад ментара даведаўся, што можна адкрыць уласны бізнес ужо ў 16 гадоў. Патэлефанаваў у Мінгарвыканкам, каб удакладніць гэту інфармацыю. Атрымалася цікавая размова. «Добры дзень, ці можна аформіць ІП у 16 гадоў?» — «Хлопчык, пазвані, калі споўніцца 18». Але я быў настойлівы і спаслаўся на артыкул 26 Грамадзянскага кодэкса. Там гаворыцца, што са згоды законных прадстаўнікоў прадпрымальніцкай дзейнасцю можна займацца з 16 гадоў. Далей была маўклівая паўза, і мне прапанавалі патэлефанаваць праз дзесяць хвілін, але папярэдзілі, што, хутчэй за ўсё, я памыляюся. Аднак высветлілася, што ніякай памылкі няма, і для майго суразмоўніка на тым канцы тэлефоннай лініі гэта інфармацыя была нечаканасцю. Мой бацька зноў мяне падтрымаў. Афармленне ІП заняло шэсць дзён. А далей я прайшоў яшчэ і працэдуру эмансіпацыі.

Цімафей растлумачыў, што калі бацькі дазволілі падлетку стаць індывідуальным прадпрымальнікам у 16 гадоў без эмансіпацыі, то для кожнага важнага кроку патрабуецца іх дазвол: каб заключыць дагавор, наняць супрацоўнікаў або ўкласці грошы ў каштоўныя паперы.

— Уявіце сабе: я прыходжу на перагаворы ў суправаджэнні бацькоў. І хто мяне ў такім разе будзе разглядаць сур'ёзна? Таму я вырашыў прайсці працэдуру эмансіпацыі. Для гэтага трэба падаць заяву і пісьмовую згоду бацькоў у мясцовы орган кіравання адукацыяй і прыкласці дакумент, на падставе якога падлетка прызнаюць цалкам дзеяздольным. Канчатковае рашэнне прымаецца сумесна з органамі апекі, — дзеліцца сваім досведам юны бізнесмен. — Калі падлетак праходзіць гэтую працэдуру, ён пачынае адказваць за ўсе свае ўчынкі. З набыццём поўнай дзеяздольнасці надыходзіць і поўная адказнасць. Некаторыя знаёмыя цікавіліся, а ці можна пасля атрымання поўнай дзеяздольнасці купляць алкаголь і цыгарэты? Нельга, усе ўзроставыя абмежаванні застаюцца ў сіле...

Між іншым, сутыкнуўся Цімафей і з праблемамі пры адкрыцці рахунку ў банку: высветлілася, што не кожная ўстанова гатова супрацоўнічаць з непаўналетнімі, а ў некаторых банках, куды звярнуўся тынэйджар, нават палічылі, што той іх разыгрывае.

— Трэба быць гатовым да таго, што падлеткаў не заўсёды ўспрымаюць усур'ёз, — папярэджвае Цімафей Галянтаў. — І не ўсе гатовы адразу размаўляць з намі на роўных. Дарослыя палохаюцца і перастрахоўваюцца. Таму вам прыйдзецца пастаянна даказваць, што вы насамрэч сур'ёзны і самастойны чалавек, ведаеце, як весці свой бізнес, і з вамі можна мець справу. Але лепш сутыкнуцца з гэтым цяпер: чым раней вы пройдзеце гэты шлях, тым больш канкурэнтаздольным будзеце ў будучыні.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Па закліку сэрца

ДНЁМ КАЛЯ СТАНКА, УВЕЧАРЫ — НА АКЦЫІ

Чым жыве найлепшы сярод працуючай моладзі валанцёрскі атрад

За 15 гадоў існавання ён зарабіў у гараджан добрую рэпутацыю. Яго рады бачыць у многіх сацыяльных цэнтрах, ва ўстановах адукацыі і аховы здароўя. На рахунку байцоў — самыя смелыя і незвычайныя валанцёрскія праекты ў краіне. Напрыклад, яны аднымі з першых пачалі ладзіць тэматычныя фотасесіі для хворых дзетак і выхаванцаў дзіцячых дамоў.
Летась на конкурсе «Валанцёр года — Добрае Сэрца» валанцёрскі атрад «Адкрытыя Сэрцы» пярвічнай арганізацыі БРСМ «Гомсельмаша» быў прызнаны найлепшым сярод працуючай моладзі. «Чырвонка. Чырвоная змена» пазнаёмілася з рабочымі прадпрыемства, якія ў вольны час дапамагаюць інвалідам, сіротам і пенсіянерам.

БЕЗ ЛІШНІХ СЛОЎ

— Вы на мае рукі не глядзіце, я толькі са змены, — кажа **Сяргей МІХАЙЛОЎСКІ,** хаваючы далоні: мазут так і не адмыўся.

Пятнаццаць гадоў таму просты слесар, які цяпер кіраўнік валанцёрскага атрада, разам з калегамі ўпершыню прыехаў у Гомельскі абласны дом дзіцяці. Знаёмыя папрасілі маладых дужых хлопцаў аб звычайнай мужчынскай дапамозе: нешта прыбіць, штосьці падфарбаваць, дзесьці мэблю перацягнуць. Адным словам, зрабіць тое, з чым выключна жаночы калектыў установы сам справіцца не мог.

— Дапамаглі раз, другі. Восенню прыехалі прыбраць лісце, а зімой — расчысціць снег. Самі не заўважылі, як у галаве пачалі з'яўляцца думкі нашталт «не дапамог дзецям — тыдзень прайшоў дарма», — успамінае Сяргей.

Сёння атрад «Адкрытыя Сэрцы» аб'ядноўвае каля 70 добраахвотнікаў «Гомсельмаша». Штогод яны ладзяць дзясяткі праектаў, ініцыятыў і акцый. Тым самым робяць крышачку лепшым жыццё соцень вельмі розных людзей.

— Ніякіх загадаў зверху аб стварэнні валанцёрскага руху на заводзе не было. Больш за тое, першыя гады мы нават не былі афармленыя як атрад. Валанцёрства ў першаснай форме: дапамагай іншым, чым можаш, без лішніх слоў, — расказвае сябра Сяргея **электрык Мікалай КОЛАШ.**

— Скажам, арганізаваць конную прагулку ці картынг-гонкі для дзяцей-інвалідаў — задача не з лёгкіх. Але ўсё рэальна, — упэўнены Сяргей.

ГАЛОЎНАЕ — ПАДБАДЗЁРЫЦЬ

Разам з тым на памяці валанцёраў нямала прыкладаў, калі атрад выпадкова выходзіў на асобныя сем'і ці людзей, якія мелі патрэбу ў дапамозе.

— Узімку мы пазнаёміліся з сёстрамі — Анастасіяй Лашкевіч і Таццянай Канцавой. Падчас Вялікай Айчыннай вайны яны, будучы зусім маленькімі, трапілі ў канцлагер, перажылі жахі тых страшных гадоў. Здаецца, такіх людзей грамадства павінна падтрымліваць ва ўсім, — расказвае Мікалай. — Аднак высветлілася, што жанчыны доўгі час ніяк не могуць трапіць на лячэнне ў шпіталь, хоць двойчы на год іх абавязаныя там прымаць. Каб дабіцца таго, што і так па праве належыць сёстрам, нам прыйшлося падключаць дэпутатаў, звяртацца па падтрымку да адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля, адміністрацыі завода, абласнога камітэта БРСМ. Патрацілі некалькі месяцаў, але справядлівасці дабіліся. Шкада, Анастасія нашай перамогі не дачакалася...

— У грамадстве заўсёды былі і будуць тыя, каму патрэбна дапамога. Таксама як і тыя, хто можа яе аказаць, — кажа Сяргей. — Да нас звяртаюцца людзі абедзвюх катэгорый. Так, аднойчы патэлефанавала пенсіянерка і пачала прапаноўваць грошы. Яна аднекуль даведалася пра атрад і вельмі хацела, каб мы перадалі сродкі тым, «каму яны сапраўды трэба». Мы нічога не ўзялі, але прапанавалі ёй самой далучыцца да адной з нашых акцый — «Збяры партфель першакласніку».

Суразмоўнік падкрэслівае, што валанцёрства і дабрачыннасць адрозніваюцца. У дзейнасці «Адкрытых Сэрцаў» на першым месцы людскія ўзаемаадносіны і эмацыянальная падтрымка.

— Галоўнае — увага і шчырая зацікаўленасць у іншых людзях, — разважае Сяргей. — Мы робім ухіл на акцыі, якія прыносяць яркія ўражанні і падымаюць настрой. Напрыклад, адна з апошніх — таварыскі матч футбалістаў ФК «Гомель» з дзеткамі, хворымі на ДЦП. Дробязь, а колькі ўспамінаў застанецца. Дарэчы, у футбалістаў акурат пасля сустрэчы скончылася чорная паласа: яны з таго моманту аніводнай гульні не прайгралі!

КАЛІ ТАТА — СУПЕРМЕН

Летась «Адкрытыя Сэрцы» сталі найлепшым валанцёрскім атрадам сярод працуючай моладзі БРСМ, а дагэтуль тройчы прызнаваліся найлепшымі ў вобласці.

— Праўда, значная частка нашых байцоў ужо і не моладзь. Напрыклад, мне зараз 41, але, калі ўсё пачыналася, было 26. Быць дарослым — не прычына, каб перастаць валанцёрыць. Атрад штогод папаўняецца маладымі хлопцамі і дзяўчатамі. Хтосьці ж павінен дзяліцца з імі сваім досведам. Акрамя таго, мы цесна супрацоўнічаем з падрастаючым пакаленнем добраахвотнікаў — валанцёрскімі атрадамі БРСМ з 45-й, 9-й, 54-й і 12-й школ і аўтамеханічнага каледжа Гомеля.

— Нехта з вядомых казаў: «Здаровыя ногі рана ці позна пачнуць спатыкацца, спіна сагнецца, але добрае сэрца застанецца такім назаўсёды». Таму нашы «Адкрытыя Сэрцы» не закрываюцца, хоць многія з нас ужо «выраслі з БРСМ», — лічыць Мікалай.

— З нашага атрада сыходзяць толькі на пенсію! А прыйсці можна ў любым узросце, — дапаўняе мужчын **Марына АХМЕТАВА.**

Яна даўно працуе эканамістам у фінансавым упраўленні завода, але валанцёрам вырашыла стаць толькі пасля таго, як выйшла з дэкрэтнага водпуску.

— З'яўленне ўласных дзяцей прымусіла задумацца пра тых хлопчыкаў і дзяўчатак, якія засталіся без бацькоў. Захацелася дзяліцца пяшчотай і з імі, — кажа Марына.

На пытанне, ці застаецца пры такім раскладзе час на сваю сям'ю, усе трое ў адзін голас адказваюць: «Застаецца!» На думку добраахвотнікаў, дзякуючы валанцёрству яны пачалі яшчэ больш цаніць кожную хвілінку побач з блізкімі.

— І хто сказаў, што ўласных дзяцей нельга браць з сабой на мерапрыемствы? Яны галоўныя памочнікі ва ўсіх пачынаннях. На фотаздымках з акцый вы нават не зразумееце, дзе нашы дзеці, а дзе сіроты і інваліды. Для іх няма ніякіх бар'ераў і перашкод. Хутка знаходзяць агульную мову, гуляюць. Дарослым ёсць чаму ў іх павучыцца, — кажа Сяргей і дзеліцца сакрэтам. — Калі я іду на чарговую валанцёрскую акцыю, мая жонка з гонарам кажа, што «муж пайшоў ратаваць свет!»

Ганна КУРАК.
Мінск — Гомель — Мінск.

«АДЦІСНУЦЬ» РЭКОРД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Мы глядзелі на старэйшых хлопцаў, якія ўжо адслужылі ў арміі, рабілі на пляцоўцы крутыя элементы, былі фізічна развітыя, класна выглядалі, і хацелі быць падобнымі да іх, — прызнаецца Яўген. — Турнікі выбралі, бо гэта даступна. Тады яшчэ не так шмат трэнажорных залаў было. Дый цікава прыйсці кампаніяй, у тую ж «лесвіцу» пагуляць — хто больш зробіць. Такі азарт! Сам не заўважаеш, як, спаборнічаючы, на новы ўзровень выходзіш.

У 2014 годзе Яўген Лось паставіў рэкорд Беларусі — адціснуўся 26 разоў з 48 кілаграмамі дадатковай вагі на поясе. «У дадзены момант на трэніроўцы раблю больш за трыццатку, — заўважае. — Прыемна бачыць прагрэс».

Спортам хлопец займаецца кожны дзень. Стаўку робіць на аб'ёмныя трэніроўкі (гэта значыць, з вялікай колькасцю падыходаў і паўтарэнняў). Заняткі на развіццё сілы цягнуцца 40 хвілін, на сілавую вынослівасць — дзве-тры гадзіны. На мінулым тыдні, напрыклад, падчас такой прагонкі Яўген з гірай 24 кілаграмы падцягнуўся 250 разоў.

За два тыдні да спаборніцтваў атлет збаўляе тэмп, а за тыдзень наогул перапыняе трэніроўкі. Не ляжыць на канапе — аддае перавагу актыўнаму адпачынку. Ходзіць у басейн, парыцца ў лазні, гуляе ў тэніс.

Замахнуцца на месца ў Кнізе рэкордаў Гінеса Яўген вырашыў пасля таго, як туды трапіў яго сябар спартсмен Максім Труханавец.

— Мне стала цікава, зайшоў на сайт, паглядзеў, якія там ёсць рэкорды ў маім сілавым кірунку. Убачыў, што ёсць некалькі дасягненняў, якія магу пабіць з мінімальнай падрыхтоўкай, — расказвае хлопец.

Для сябе ён выбраў адціскванні на брусах з дадатковай вагой 40 фунтаў (каля 18,2 кілаграма). Папярэдні рэкорд быў 49 разоў.

Яўген зарэгістраваўся на сайце ў сакавіку. Адказ атрымаў праз тры месяцы — з поўным пералікам усіх умоў і дакументаў, якія трэба будзе перадаць камісіі. Хлопец прызнаецца: самым складаным для яго аказаліся менавіта арганізацыйныя моманты. Так, напрыклад, рэкорд павінны фіксаваць два хранаметрысты, два суддзі (спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, сертыфікаваныя ў сферы фізкультуры і спорту), тры камеры: спераду ад атлета, збоку і ззаду.

Да спробы бабруйчанін рыхтаваўся каля двух тыдняў. Дадатковая вага для яго аказалася не надта вялікай, але раней ён не адціскаўся з заплечнікам (толькі з гірай ці поясам), таму трэба было адаптавацца. Першы, у адрозненне ад іншых уцяжарвальнікаў, крыху змяшчае цэнтр цяжкасці, і выконваць практыкаванне з ім складаней.

Спроб у Яўгена было тры. Першы раз за хвіліну ён паспеў адціснуцца 56 разоў. Ужо добры вынік, але сябры запэўнівалі: ты можаш лепш. І нездарма. На трэці раз хлопец зрабіў на 11 паўтарэнняў больш.

Пасля таго як відэа і ўсе дакументы былі адпраўлены, чакаць пацвярджэння давялося тры месяцы. Гэта яшчэ самы хуткі варыянт для бясплатнай заяўкі. Каб паскорыць працэс, трэба заплаціць каля тысячы долараў, — тады запыт разгледзяць на працягу пяці працоўных дзён. А за дзесяць тысяч долараў камісія сама прыляціць да вас дадому.

Пападанне ў Кнігу рэкордаў Гінеса не мае на ўвазе грашовых выплат. Але, лічыць Яўген, гэта вельмі ганарова — аказацца ў спісе самых-самых.

— А што, калі ваш рэкорд паб'юць?

— Давядзецца паставіць наноў, — усміхаецца хлопец у адказ. — Ёсць яшчэ парачка рэкордаў, якія магу пабіць, але загадваць не буду. Патрэбны час, каб падрыхтавацца.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота з архіва героя.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
22 11 2018 г.

Роля не для кожнага

«Я САМА БЫЛА НА ІХ МЕСЦЫ»

Як спартсменка стала паслом Юнацкіх Алімпійскіх гульняў

Анастасія ЛЕСІК — былая спартсменка, яна дзевяць гадоў аддала гарналыжнаму спорту. Яе першы візіт на Юнацкія Алімпійскія гульні ў Інсбрук у 2012 годзе быў звязаны менавіта з ім. Дзяўчына прыняла ўдзел у спаборніцтвах у слаламе і заняла там 17-е месца. Аднак, пакінуўшы прафесійны спорт, Насця не захацела развітацца з алімпійскім рухам і знайшла сябе ў новай ролі.

Перад Юнацкімі Алімпійскімі гульнямі 2016 года ў Лілехамеры Нацыянальны алімпійскі камітэт прапанаваў Анастасіі паспрабаваць сябе ў якасці маладога пасла. «Гэта неверагодна ўзрадавала, — дзеліцца Анастасія. — Паколькі я ўжо ўдзельнічала ў Юнацкіх Алімпійскіх гульнях, разумела маштаб турніру, заставалася толькі паглыбіцца ў свае службовыя абавязкі. Аказалася, гэта ўсё вельмі цікава». Пасада маладога пасла, хутчэй, абавязвае стаць старэйшым сябрам для юных спартсменаў. «Рабяты ў 14—16 гадоў і так дастаткова закрытыя з-за ўзросту, а тут яшчэ і спаборніцтвы такога маштабу. Наша задача — дапамагчы ім раскрыцца, правільна настроіцца. Словам, зрабіць усё магчымае, каб ад Гульняў у іх засталіся толькі добрыя ўражанні», — расказвае суразмоўніца.

На Юнацкіх Алімпійскіх гульнях кожная дзяржава прадстаўляе свайго пасла. Такім чынам арганізацыйны камітэт імкнецца аб'яднаць спартсменаў з розных краін, сфарміраваць дух алімпійскага руху з дапамогай іх сумеснага ўдзелу ў розных мерапрыемствах, арганізацыя якіх і ўскладаецца на плечы маладых паслоў. «Можна сказаць, што я з'яўляюся сувязным звяном паміж культурна-адукацыйнай праграмай Міжнароднага алімпійскага камітэта, якую распрацоўваюць спецыяльна для Юнацкіх Алімпійскіх гульняў, і рабятамі. Гэтая праграма скіравана на стасункі, знаёмства з іншымі ўдзельнікамі, праходжанне розных квізаў ад антыдопінгавага агенцтва, арганізацыю сустрэч з алімпійскімі чэмпіёнамі», — дадае Анастасія. За тры месяцы да пачатку Гульняў з маладымі пасламі праводзяць розныя трэнінгі на тэмы аб'яднання і пераадолення сваіх страхаў.

Вопыт Лілехамера не стаў для Анастасіі адзіным, сёлета яна павезла беларускіх спартсменаў у Аргенціну, ужо на летнія Юнацкія Алімпійскія гульні. «Са спартсменамі я знаходжуся побач 24 гадзіны ў суткі, таму зразумела, што многае заўважаю: іх перажыванні, страхі. Падчас спаборніцтваў таксама ўвесь час з імі. Нават калі рабяты выступаюць адначасова ў розных месцах, я стараюся паспець усюды, пабыць і падтрымаць абсалютна кожнага. Таму што падтрымка — вельмі важная. Неадкладна рэагую, калі ў іх нешта здараецца. А мой козыр у тым, што я сама была на іх месцы і не па чутках ведаю ўсё, што адчуваюць яны», — расказвае Насця.

У вольны ад «пасольскай дзейнасці» час Насця Лесік займаецца трэнерскай працай — вучыць дзяцей гарналыжнаму спорту. Як прызнаецца дзяўчына, усё гэта дае ёй натхненне і энергію.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

КАБ ЖЫЛІ САМАЛЁТЫ Ў ПАЛЁТАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ.»)

— Не ведаю, як калектыў паставіўся, калі я прыйшла. Напэўна, пахіхіквалі: «Дзяўчо вырашыла круціць гайкі, што з яе ўзяць». Але асабіста мне нічога крыўднага ніхто не казаў. Цяпер ужо давяраюць.

Вольга расказвае, што авіятэхнікаў-навічкоў чакае выпрабаванне багажным аддзяленнем. Маладых спецыялістаў адпраўляюць туды клеіць стыкі панеляў спецыяльнай гермастужкай, якая не прапускае паветра. Работа вельмі нязручная: адсек невысокі і даводзіцца поўзаць на каленках.

Допуск на самастойнае абслугоўванне самалётаў дзяўчына атрымала не адразу — для гэтага трэба было прайсці дадатковыя курсы. Вучоба і стажыроўка займаюць каля двух месяцаў, і допуск выдаецца не на ўвесь авіяпарк, а на асобную мадэль. Вольга ўжо асвоіла Boeing 737 Classic і Embraer 175 і 195.

У ангар на рамонт самалёты трапляюць не абавязкова пасля паломкі. Часцей гэта планавае тэхабслугоўванне. Так, Boeing 737 Classic адпраўляюць да тэхнікаў у ангар пасля 250 гадзін налёту. Адна з самых частых работ — замена колаў: з-за інтэнсіўнасці выкарыстання яны хутка зношваюцца. Праўда, Вольга колы, а таксама тормаз не мяняе, бо яны вельмі цяжкія (нават не кожнаму мужчыну хапае сіл зрабіць гэта аднаму).

«Тэхагляд» паветранага судна можа заняць некалькі дзён і нават цэлы месяц. Напрыклад, калі праводзіцца c-check (від абслугоўвання), самалёт практычна цалкам разбіраюць. «Першы раз рабіць гэта было вельмі цікава. Заходзіш у салон — а там толькі «шкілет». Нячаста такое можна ўбачыць», — дзеліцца ўражаннямі Вольга.

Цікава, а як сябе адчувае авіятэхнік на борце самалёта ў палёце? Надзейна, адказвае дзяўчына. Толькі бывае непрыемна бачыць, як іншыя пасажыры неахайна паводзяць сябе ў салоне: паламаныя рамяні бяспекі і столікі потым давядзецца рамантаваць ёй з калегамі.

Калі Вольга расказвае пра працу, часам задумваецца, як пэўныя агрэгаты называюцца на рускай мове: прасцей па-англійску, бо ўся дакументацыя вядзецца менавіта на гэтай мове.

Абнаўляць веды пра тэхніку трэба пастаянна. Перыядычна праводзяцца курсы па авіяцыйнай бяспецы, чалавечым фактары. А калі спецыяліст перапыняе стаж работы на год, то пасля яму нанова давядзецца пацвярджаць сваё пасведчанне, каб атрымаць права самастойна абслугоўваць самалёты.

Што патрэбна, каб стаць авіятэхнікам? Вольга адзначае, што галоўнае — інтарэс да прафесіі і мэтанакіраванасць:

— Калі я вучылася, мне казалі: «Ды не будзеш ты працаваць з тэхнікай, пасадзяць за паперкі». Трэба не звяртаць увагі на гэта і проста ісці да сваёй мэты.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Бачыць мэту

ГІСТОРЫЯ І ГЕАГРАФІЯ

«залатога чалавека» з музея

Для 23-гадовага Багдана ГОЛЬМАНТА, ураджэнца Лідчыны, месцам размеркавання стаў Чэрвеньскі раённы краязнаўчы музей. На працы ён — старанны навуковы супрацоўнік, экскурсавод, дома — узорны муж і тата. Цікавіцца гісторыяй родных мясцін і адначасова стварае гісторыю свайго жыцця. Якую ён абавязкова раскажа нашчадкам...

У дзяцінстве Багдан марыў стаць, як сам кажа, «лётчыкам-верталётчыкам». Але ў выніку на выбар будучай прафесіі паўплывала школьнае захапленне гісторыяй. У пачатку сёмага класа ён цалкам прачытаў свае падручнікі па «Сусветнай гісторыі» і «Гісторыі Беларусі», потым — кнігі старэйшага брата за наступны год. Калі ж былі адолены і яны, узяўся за дадатковую літаратуру.

У сям'і Багдана не было ніводнага навукоўца. Але яго бацька-электрык імкнуўся стварыць радавод, маці шмат чытала. У сям'і хлопец быў экспертам, прафесійна адказваў на пытанні бацькоў і сяброў. Таму сумненняў не было: Багдану трэба на гістфак.

— Паступіць адразу не атрымалася, — прыгадвае Багдан. — Спачатку я вырашыў адпачыць год перад наступнай спробай. Але падумаў: навошта дарма сядзець? І скончыў вучылішча. Не абмінуў долі стаць электрыкам, як бацька. *(Усміхаецца.)* Далей пайшоў вучыцца ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на музеязнаўства. Маімі выкладчыкамі былі сапраўдныя прафесіяналы, вядомыя гісторыкі. Напрыклад, Алег Анатольевіч Трусаў расказваў пра часы, у якія жыў сам, бо пра іх мала было напісана ў кнігах. Што-што, а цікава расказваць ён умее. *(Усміхаецца.)* А Ірына Навумаўна Колбава змагла захапіць мяне нумізматыкай. Ад яе даведаўся, што гісторыя нашых грошай насамрэч багатая...

Гісторыя сям'і Багдана таксама багатая і цікавая.

— Па нацыянальнасці мы — палякі, — гаворыць ён. — А вось прозвішча, хутчэй за ўсё, анямечанае. Гольмант сугучна з «гольдман», што ў перакладзе з нямецкага — «залаты чалавек». Была версія, што яно аднекуль з Ірландыі... *(Смяецца.)* Маці — таксама з польскімі каранямі. Што цікава, сам Багдан польскую мову вывучыў толькі ва ўніверсітэце. Яна спатрэбілася для курсавой працы па геральдыцы. «Вырашыў я пісаць пра польскі герб, — расказвае хлопец. — А ў нашых бібліятэках інфармацыі было вельмі мала. Давялося шукаць у польскіх крыніцах. Знаходзіў сайты, сам перакладаў, пісаў — мне падабалася».

А яшчэ Багдан добра размаўляе па-беларуску і вядзе на беларускай мове экскурсіі ў музеі. У прыватнасці, ездзіць з выстаўкамі па школах, расказвае пра ордэны і медалі Вялікай Айчыннай вайны.

— Мне падабаецца мая прафесія, — кажа Багдан. — Знаёмлюся з творчымі людзьмі, маю стасункі з дзецьмі, тлумачу ім штосьці, як настаўнік. Бывае, вядома, цяжка. Напрыклад, распісваю я сабе экскурсію пра ўзнагароды для 13-14-гадовых, а прыводзяць першакласнікаў. Тады мяняю тактыку. Тут трэба і сур'ёзным быць, і зрабіць так, каб цябе зразумелі... А яшчэ для нашай прафесіі патрэбна фантазія. Калі расказваем гісторыю карціны, пра якую аўтар амаль нічога не гаварыў, даводзіцца штосьці выдумляць, хоць я гэтага і не люблю. Здараецца, што мастак прыходзіць на выстаўку сваіх карцін і чуе: «У гэтым творы аўтар хацеў выказаць свой боль...» Мастак паслухае-паслухае і скажа: «Мабыць, так, мабыць, так. Я і не думаў пра гэта раней, а вось цяпер дакладна...». Гэта смешна.

Калектыў музея і бібліятэкі Багдану таксама даспадобы. «Я ўсім на дні нараджэння вершыкі па-беларуску пішу, — кажа ён. — За год ужо кожнага так павіншаваў. А яны мне ў адказ калектыўна напісалі. Весела было».

...Дарэчы, ва ўніверсітэце Багдан не толькі набыў прафесію, але і жонку сабе знайшоў. «Я вучыўся на музейнай справе, Ганна — у паралельнай групе, на менеджменце па турызме. Убачыліся, разгаварыліся, пачалі сустракацца. Пабраліся шлюбам на трэцім курсе, таму паспелі разам пажыць у інтэрнаце. Цяпер яна са мной, у Чэрвені. Гадуе нашу маленькую Кірачку».



З жонкай Ганнай.

Адпрацоўваць Багдану засталося менш за год. Гаворачы пра далейшыя планы, ён кажа, што хоча вярнуцца на радзіму, у Ліду, і працаваць у мясцовым краязнаўчым музеі. Паляпшаць існуючыя экспазіцыі, прыдумляць новыя, вывучаць і дапаўняць гісторыю родных мясцін.

Юлія АДАМОВІЧ,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі БДУ.

Сам сабе рэжысёр

ЗМЯНІЦЬ ЛЁС ГАЛОЎНАГА ГЕРОЯ,

ці Адкуль бяруцца фанфікі

Гэтае паняцце ўтварылася ад англійскага fan fiction (фан-літаратура), што азначае аматарскую варыяцыю па матывах любога арыгінальнага твора: кнігі, фільма, серыяла, мультфільма, комікса, камп'ютарных гульняў. Менавіта па іх і складаецца новая ідэя, дзе аўтар можа без правілаў і абмежаванняў надаць любыя рысы абранаму персанажу, зрабіць яго цёмнавалосым або бялявым, ажаніць з кім заўгодна, вырашыць, будзе канец гісторыі шчаслівы альбо не. Усе фанфікі акумулююцца на сайце «Фікбук», дзе кожны ахвотны можа апублікаваць сваю работу, устанавіць зваротную сувязь са сваімі чытачамі. А карыстальнікі на ім аб'ядноўваюцца ў нефармальныя суполкі, якія цікавяцца якой-небудзь адной тэмай: з серыяла, кнігі, фільма і г. д.

Цікава, а як чалавек пачынае пісаць фанфік і якой мэтай кіруецца, калі са «старога» стварае новае? Аб гэтым і не толькі нам расказала Алена АСТАПОВІЧ. Дзяўчына захапляецца фанфікамі ўжо даўно.

— З чаго пачалося тваё знаёмства з імі?

— Свой першы фанфік я напісала ў 12 гадоў, прычым не ведала, што гэта так называецца. Калі чарговы раз пераглядала «Гары Потэра», абуралася, бо не разумела, чаму ў фільме не ўдзяляецца належнага часу раскрыццю ўзаемаадносін Альбуса Дамблдора і Мінервы Макгонагал. Я была ўпэўненая, што яны былі б добрай парай. Менавіта таму пачала ствараць сваю гісторыю іх кахання. У сшытку накідала літаральна старонку тэксту, зрабіўшы сюжэт такім, якім хацела. Паказала замалёўку сяброўцы, яна сказала, што гэта шэдэўр і трэба яго дапісаць. Атрымаўся тэкст на 15 старонак, які я дала пачытаць настаўніцы па рускай мове. Ужо тады зразумела, што гэта не вельмі добрая работа, але педагог не хацела мяне крыўдзіць, яна сказала, што ўсё нармальна, толькі над дыялогамі варта папрацаваць.

«Я не заўсёды наперад ведаю, чым павінен скончыцца мой фанфік. Бывае, што задумка адна, а выходзіць зусім іншае».

Пасля першай спробы напісання любоўнай гісторыі я пачала пісаць фанфікі па серыяле «Сваты» і публікаваць іх на сваёй старонцы «УКантакце», а потым у розных суполках гэтай сацыяльнай сеткі. У мяне ўтварылася невялікае кола чытачоў, прыкладна чалавек 30, якім падабаўся гэты серыял. Яны пакідалі каментарыі — так я атрымлівала зваротную сувязь, і гэта матывавала працаваць далей.

У 10 класе пачала пісаць драбл (кароткая замалёўка з жыцця персанажаў да дзесяці старонак) па «Ранетках», па любоўнай лініі Людмілы Барзовай і Віктара Шынскага. Гераіню ў фільме іграла Алена Барзова, яна мне падабалася як чалавек і як актрыса, мне хацелася пазнаёміцца з ёй, і я вырашыла напісаць ёй у «Фэйсбуку». Яна адказала мне, што ёй спадабалася мая работа, і мы пачалі перыядычна спісвацца. Алена расказвала пра свае ўражанні, давала парады, дзівілася, што юная дзяўчына так добра можа перадаць вобраз, характар дарослай гераіні фільма.

— Колькі работ у цябе ўжо ёсць на «Фікбуку», пра якіх персанажаў падабаецца пісаць і дзе знаходзіш час для гэтай справы?

— На сёння апублікавана 27, некаторыя з іх скончаныя, некаторыя не, але ў працэсе. У мяне ёсць звычка — паралельна працаваць над некалькімі гісторыямі, і гэта не вельмі добра. Часам забываю, на чым я спынілася, як хацела працягнуць гісторыю, таму саджуся і перачытваю ўсё, зноўку планую развіццё падзей фанфіка.

У асноўным пішу па матывах серыяла «Хадзячыя мерцвякі» альбо па «Гары Потэру». Амаль заўсёды раблю гэта ад першай асобы — жанчыны. Аб'ём маіх фанфікаў вар'іруецца ад дзвюх да сямідзесяці старонак.

Пішу ў любы час, вельмі часта апоўначы пад сумную музыку. Мне не патрэбна цішыня. Каб натхніцца, часта пераглядаю фатаграфіі персанажаў, гляджу розныя відэаролікі, каб пранікнуцца, «злавіць хвалю». Я не заўсёды наперад ведаю, чым павінен скончыцца мой фанфік. Бывае, што задумка адна, а выходзіць зусім іншае.

«Калі пішу, не думаю, якія падабраць словы, проста саджуся і слухаю голас унутры сябе».

— Што табе найперш падабаецца на «Фікбуку»?

— Тут усе аўтары і чытачы сочаць за пісьменнасцю. Любому карыстальніку можна выпраўляць памылкі. Гэта называецца «публічная бета», у мяне яна таксама ўключана. Важна, каб работа была без памылак. Да таго ж можна атрымаць узнагароду за пісьменнасць. У мяне яна ёсць. Таксама я з'яўляюся афіцыяльнай бетай з пісьменнасцю ў 95 працэнтаў. Выпраўленне як сваіх, так і чужых недахопаў добра дапамагае мне ў маёй рэдактарскай дзейнасці. Зараз я вучуся на факультэце журналістыкі на спецыяльнасці «Літаратурная работа. Рэдагаванне» і пасля планую працаваць па ёй, мне гэта падабаецца, таму «Фікбук» — добры памочнік для развіцця прафесійных навыкаў.

— Літаратура заснавана на жанрах — раман, апавяданне і г. д. А ці ёсць яны ў фанфіках?

— Так. Самая папулярная катэгорыя фанфікаў — гэта анімэ і манга, а папулярны жанр — слэш (любоўная лінія «м+м»).

— Ці думала выпусціць свае работы ў кніжным фармаце?

— Вельмі часта! Фанаты таксама не раз прасілі зрабіць кніжны зборнік маіх фанфікаў, але, на жаль, пакуль гэта складана ажыццявіць. Любому выдавецтву патрэбна гарантыя, што кніга акупіцца, што яна спадабаецца чытачам, а такую гарантыю даць складана. Хаця ў адной знакамітай кнігі фанфікаў гэта добра атрымалася — я пра «50 адценняў шэрага». Хто ў тэме, той ведае, што першапачаткова гэта была кніга фанфікаў пра «Змярканне».

— Алена, ці ёсць у цябе іншыя захапленні?

— Люблю савецкія фільмы, савецкіх акцёраў. Мая любімая актрыса — Людміла Гурчанка — у свой час настолькі прыцягнула сваёй індывідуальнасцю, што я перагледзела ўсе яе стужкі (а іх больш за 120), серыялы, інтэрв'ю. Мне падабаецца, як яна сябе паводзіла, гаварыла, апраналася. Яна была асаблівай, «несавецкай у савецкім грамадстве». Калі паступала на журфак, пісала пра Людмілу Гурчанку на экзамене.

— Як думаеш, напісанне фанфікаў — гэта назаўсёды?

— Упэўнена. Мяне натхняе літаральна кожны прагледжаны серыял, фільм, і я пачынаю ствараць новую гісторыю персанажаў, якія мне сімпатычныя. Калі пішу, не думаю, якія падабраць словы, проста саджуся і слухаю голас унутры сябе. І таму жадаю кожнаму чалавеку знайсці «тое самае» хобі, якое будзе дастаўляць шмат добрых эмоцый і шчасця.

Дар'я ШЛАПАКОВА,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі
БДУ.

Занятак па душы

МІНІМАЛІЗМ НА КОНЧЫКУ ІГОЛКІ

Анастасія СТРАЛЬЦОВА па адукацыі архітэктар, яна дзесяць гадоў адпрацавала графічным дызайнерам у Мінску. За гэты час дзяўчына рэалізавала дзясяткі цікавых праектаў. А потым вырашыла спыніцца на мастацтве... татуіроўкі.

— Гэтая мара з'явілася ў мяне ў 15 гадоў. Тады на адным з тэлеканалаў ішла вядомая перадача «Маямскае чарніла» з шыкоўнай татуіроўшчыцай Кэт Фон Дзі. Натхніўшыся ёю, я зрабіла сабе першае тату. Але бацькі былі абураныя, калі ўбачылі маю «прыгажосць», сказалі, што «наколкі» не для дзяўчыны. Час ішоў, я скончыла архітэктурны факультэт, уладкавалася на працу. Здавалася, што справы ідуць нядрэнна, але ў 27 гадоў пачала адчуваць нерэалізаванасць, таму адважылася на кардынальныя перамены ў жыцці. Напачатку дапамогі з боку не было, вучылася мастацтву тату самастойна. Рабіла малюнкі на свіной скуры, агародніне, штучных матэрыялах.

Цікава, што Насця набівае татуіроўкі толькі па сваіх эскізах, у стылі мінімалізму, у якім, дарэчы, адчувае сябе ўпэўнена і свабодна. Адну і тую ж работу ніколі не паўтарае. На стварэнне эскізаў яе натхняюць думкі і ідэі кліентаў. Часцей за ўсё дзяўчына робіць тату на руках, сцёгнах, а вось на пальцах, вушах і ступнях — ніколі.

— Ці павінен быць сэнс у татуіроўкі?

— Лічу, што неабавязкова. Набіваючы сабе, магу прымеркаваць яе да пэўных падзей, а часам проста выбіраю тое, што візуальна падабаецца. На маім целе больш за 15 татуіровак, некаторыя ўжо ператварыліся ў адну суцэльную. У асноўным гэта кветкі і птушкі, але ёсць і незвычайныя: жанчына, у якой замест верхняй часткі галавы расліна, парная татуіроўка з мужам, малюнкі розных жывёл, рыб, ягад і выява... лямпачкі. Да сваіх кліентаў я не лезу з роспытамі аб сэнсе тату, лічу, што гэта асабістая справа кожнага.

Падчас нашай гутаркі Насця расказала, што, па яе назіраннях, дзяўчаты лепш пераносяць боль, чым хлопцы. Але абагульняць не варта, бо ў кожнага чалавека свой балявы парог: для аднаго набіваць малюнак на скуры балюча, для другога — прыемна.

Ад чаго залежыць колер татуіроўкі? Бывае, што чорны праз тыдзень-два становіцца зялёным. Як гэтага пазбегнуць? Суразмоўніца кажа, што такога быць не павінна, калі гэта здарылася, значыць, вам зрабілі тату няякаснымі пігментамі. Таму набіваць малюнак трэба ў салоне з добрай рэпутацыяй.

— Добры спецыяліст, які знайшоў свой стыль, прыйшоў да поспеху самастойна, будзе запатрабаваны заўсёды. Важна любіць сваю справу, а не проста зарабляць грошы, — дзеліцца Насця. — Напрыклад, на пачатку свайго прафесійнага шляху я разумела, што трэба развіваць навык малявання. Не ва ўсіх тату-майстроў ёсць такі прыроджаны талент, у маім выпадку ён набыты. Не лішнім будзе напомніць і пра тое, што залог паспяховай кар'еры ў наш час — добрая піяр-кампанія. Многія кліенты знаходзяць мяне праз «Інстаграм». Эскізы работ на сваёй старонцы я публікую кожны дзень, каб чалавек мог зразумець, падабаецца яму мая творчасць або не. А каб зачапіць вока патэнцыйных кліентаў яшчэ больш, раблю фатаграфіі эстэтычнымі, у адзіным стылі.



Дар'я ШЛАПАКОВА,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі
БДУ.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона

Аукцион состоится 11 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.
Последний день подачи заявок и внесения задатка: 10 декабря 2018 года до 15.00.
Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод», УНН 700103211, Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Набережная, 10

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, **тел.: +37 5222 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 767-65-36**

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение пяти календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Установленная в ходе аукциона цена продажи Объекта будет увеличена на сумму налога на добавленную стоимость (НДС 20 %) согласно законодательству Республики Беларусь. Оплата предмета аукциона будет производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона. А также Победитель аукциона возмещает стоимость затрат на проведение оценки имущества в размере 15,79 бел. руб. с учетом НДС за один лот на условиях заключенного договора купли-продажи

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 29.08.2018

Объекты продажи:

№ Лота	Наименование имущества	Цена продажи без учета НДС, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	№ Лота	Наименование имущества	Цена продажи без учета НДС, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
Лоты № 1–10	Бродильный чан	2 325,60	232,56	Лот № 236	Брагоперегонная колонна 800	47 003,80	4 700,38
Лот № 11	Вакуумпрерыватель	107,77	10,78	Лоты № 237–246	Бродильный чан	2100,73	210,07
Лот № 12	Вакуумпрерыватель	6 103,25	610,33	Лот № 247	Дефлегматор барабанного типа	1 319,22	131,92
Лоты № 13–21	Дрожжанка	2 612,50	261,25	Лоты № 248–252	Дрожжанка инв. 422	2 612,50	261,25
Лот № 22	Дрожжевая линия	1 023,19	102,32	Лот № 253	Емкость 25 куб. м (водянка)	1 543,45	154,35
Лоты № 23–24	Емкость для спирта гор.	1 353,75	135,38	Лот № 254	Емкость 25 куб. м для спирта-сырца	4 191,19	419,12
Лот № 25	Емкость для хранения серной кислоты	563,06	56,31	Лот № 255	Емкость 25 куб. м для спирта-сырца	1 058,90	105,89
Лот № 26	Емкость пром. вод. Спирт	269,85	26,99	Лот № 256	Емкость 27 куб. м для спирта-сырца	1 148,07	114,81
Лот № 27	Емкость со шнеком	5 620,96	562,10	Лот № 257	Емкость 28 куб. м для ФП	1 181,95	118,20
Лот № 28	Компрессор	10 455,96	1 045,60	Лоты № 258–259	Емкость 33 куб. м для спирта-сырца	5 532,37	553,24
Лот № 29	Линия подачи бражки	1 042,88	104,29	Лот № 260	Емкость для хранения ФП	1 091,06	109,11
Лот № 30	Линия подачи сусла в дрожжанку	1 297,69	129,77	Лот № 261	Емкость из нерж. стали для серной кислоты	616,81	61,68
Лот № 31	Насос HPS 32-80	527,99	52,80	Лот № 262	Емкость нерж. 12,5 тыс. дал.	32 737,50	3 273,75
Лот № 32	Насос АПВ 125	2 891,58	289,16	Лот № 263	Компрессор ГСВ 06/12	520,95	52,10
Лот № 33	Насос АХ 50-32	1 232,90	123,29	Лот № 264	Компрессорная установка	12 306,06	1 230,61
Лот № 34	Насос ФГПО 120 75 1500	1 586,77	158,68	Лот № 265	Насос 2ЭЦВ 8-25-110	741,98	74,20
Лот № 35	Насос ФГПУ 120;16	796,57	79,66	Лот № 266	Насос АСНВ-80	6 809,18	680,92
Лот № 36	Насос центробежн.	1 130,16	113,02	Лот № 267	Насос К-20-30 консольн.	236,14	23,61
Лоты № 37–38	Насос центробежн.	2 891,58	289,16	Лот № 268	Насос НМШ 5-25 шестеренный	582,07	58,21
Лот № 39	Насос центробежный АНС-60	426,94	42,69	Лот № 269	Насос НМШ 5-254,4, мазутный, шестереночный	539,52	53,95
Лоты № 40–41	Разварник	16 295,85	1 629,59	Лот № 270–271	Насос НСЦЛ центробежный 20-24	2 157,48	215,75
Лот № 42	Электронасос ЭЦВ 82510	741,98	74,20	Лот № 272	Насос С Д 25/14	446,79	44,68
Лот № 43	Электронасос ЭЦВ 82510	456,60	45,66	Лот № 273	Насос СМ 80-50-200-4	541,39	54,14
Лот № 44	Электронасос ЭЦВ погружной	741,98	74,20	Лот № 274	Насос СР 5-22А	1 683,58	168,36
Лот № 45	Бражная колонна	31 860,41	3 186,04	Лот № 275	Насос центробежный К-45/30А	292,36	29,24
Лоты № 46–49	Дрожжанка	1 500,00	150,00	Лот № 276	Насос ЦСНГ центробежный	1 801,59	180,16
Лот № 50	Емкость для спирта	2 351,50	235,15	Лот № 277–278	Насос Ш 40-18 шестеренный	1 035,99	103,60
Лот № 51	Емкость для ферментов	89,49	8,95	Лоты № 279–280	Насос ЭЦВ 8-25-100	741,98	74,20
Лот № 52	Емкость под кислоту, метал.	2 105,92	210,59	Лот № 281	Осахариватель (заторный чан)	4 742,75	474,28
Лоты № 53–54	Емкость спиртовая инв. 59	1 067,43	106,74	Лот № 282	Осахариватель (заторный чан)	2 999,37	299,94
Лот № 55	Емкость спиртовая	1 071,96	107,20	Лот № 283	Разварник СП-1163	17 925,43	1 792,54
Лот № 56	Емкость спиртовая	1 577,17	157,72	Лот № 284	Дробилка ДЛ-5	10 033,91	1 003,39
Лоты № 57–58	Заторный чан	1 875,00	187,50	Лот № 285	Дробилка ДЛ-5	5 016,95	501,70
Лот № 59	Мерник 250 дал	4 118,90	411,89	Лот № 286	Дробилка для яблок	6 201,09	620,11
Лот № 60	Мерник 250 дал	2 869,93	286,99	Лот № 287	Дрожжанка	4 720,08	472,01
Лоты № 61–62	Мерник 75 дал инв. 36	892,86	89,29	Лоты № 288–291	Дрожжанка	5 806,50	580,65
Лот № 63–65	Насос ассцл 20,24 центроб. вихрев	2 157,48	215,75	Лот № 292	Емкость V 50 куб. м н/ж	7 651,75	765,18
Лот № 66	Насос нциф-100	1 892,92	189,29	Лоты № 293–295	Емкость V 50 куб. м н/ж	7 594,62	759,46
Лот № 67	Насос CR 10-10F	1 654,57	165,46	Лот № 296	Емкость V 50 куб. м н/ж	7 613,95	761,40
Лот № 68	Насос сд 32,40	539,59	53,96	Лоты № 297–299	Емкость V 50 куб. м н/ж	8 412,73	841,27
Лот № 69	Насос цнс 38,176	2 439,40	243,94	Лоты № 300–301	Емкость V 50 куб. м н/ж	7 363,38	736,34
Лот № 70	Насос цнст 138,88	1 117,52	111,75	Лоты № 302–303	Емкость V 50 куб. м н/ж	7 557,09	755,71
Лоты № 71–74	Насос эцв 8-25-100	684,90	68,49	Лот № 304	Емкость для кизельгурта	1 201,39	120,14
Лот № 75	Насос эцв 8-25-40	1 475,55	147,56	Лоты № 305–307	Емкость для осадка	7 837,30	783,73
Лоты № 76–78	Разварник инв. 201	17 974,03	1 797,40	Лот № 308–310	Емкость н/ж 20 куб. м	4 344,39	434,44
Лот № 79	Реактор солераствор.	1 584,03	158,40	Лоты № 311–312	Емкость н/ж 20 куб. м	4 343,53	434,35
Лот № 80	Холодильная колонна	241,22	24,12	Лот № 313	Емкость РБ 07-50	7 954,85	795,49
Лот № 81	Холодильная колонна	75,55	7,56	Лот № 314	Емкость РБ 07-50	7 308,94	730,89
Лоты № 82–91	Чан бродильный	1 258,72	125,87	Лот № 315–318	Емкость РБ 07-50	7 954,86	795,49
Лот № 92	Чан из н/ж стали	5 005,25	500,53	Лоты № 319–322	Емкость РБ-07-50	9 880,47	988,05
Лот № 93	Труба медная МзР 20х2х5000 (45,9 кг)	326,24	32,62	Лоты № 323–324	Емкость РБ-07-50	7 946,44	794,64
Лот № 94	Труба медная МзР 25х2х5000 336,0 кг	2 985,21	298,52	Лоты № 325–327	Емкость РБ-07-50 инв. 1455цп	9 880,47	988,05
Лот № 95	Труба медная МзР 32х2х5000 171,2 кг	1 941,55	194,16	Лоты № 328–330	Комплект оборуд. купажиров. (3 шт.)	20 146,16	2 014,62
Лот № 96	Труба медная МзР 45х2,5х5000 359,1 кг	4 766,33	476,63	Лот № 331	Компрессор	1 036,88	103,69
Лот № 97	Труба медная МзР 55х3х5000 1337,2 кг	14 256,53	1 425,65	Лот № 332	Купажная емкость	8 048,37	804,84
Лот № 98	Труба медная МзР 75х3х5000 212,5 кг	1 842,25	184,23	Лот № 333	Купажная емкость	1 768,74	176,87
Лот № 99	Труба медная МзР 85х2,5х5000 56,4 кг	407,47	40,75	Лоты № 334–335	Машина моечная	7 551,36	755,14
Лот № 100	Труба медная МзР 105х2,5х5000 572,58 кг	4 136,62	413,66	Лот № 336	Машина обдирочная Т1-КУ2М	3 759,12	375,91
Лот № 101	Труба медная МзР 155х2,5х5000 84 кг	1 276,27	127,63	Лот № 337	Мезговая емкость № 3	4 651,39	465,14
Лот № 102	Труба медная МзР 206х3х5000 771,8 кг	5 575,90	557,59	Лот № 338	Мезговая емкость	2 736,21	273,62
Лот № 103	Труба медная МзР 260х5х5000 918 кг	8 290,15	829,02	Лот № 339	Мезговая емкость	739,31	73,93
Лот № 104	Углекислотный баллон в количестве 428 шт.	49 755,00	4 975,50	Лот № 340	Мезговая емкость	3 188,27	318,83
Лот № 105	Спиртоловушка F= 10 кв. м	4 862,30	486,23	Лот № 341	Мезговая емкость	2 736,21	273,62
Лот № 106	Конденсатор F=10 кв. м	4 959,00	495,90	Лот № 342	Моечная машина Т1-КУМ-5	2 017,75	201,78
Лот № 107	Авто розлива Е1ВРА6А	35 362,62	3 536,26	Лот № 343	Мойка барабанная КМ-2-1	1 294,80	129,48
Лот № 108	Автомат АИ-500	12 276,22	1 227,62	Лот № 344	Насос АНС-130	599,31	59,93
Лоты № 109–111	Автомат БАЗМ	960,07	96,01	Лот № 345	Насос АНС130	1 347,38	134,74
Лот № 112, 121	Автомат для наклейки акцизных марок	8 320,61	832,06	Лот № 346	Насос вакуумный	1 109,66	110,97
Лот № 113–114	Автомат для наклейки акцизных марок А07	10 240,75	1 024,08	Лот № 347	Насос ВВН1-3	1 613,53	161,35
Лот № 115	Автомат марки ВЭМ	8 320,61	832,06	Лот № 348–349	Насос винт. ОНВ 6М	2 141,41	214,14
